

СААЗ: БЕЛАРУСЫ П'ЮЦЬ 18 ЛІТРАЎ СПІРТУ Ў ГОД

9

МОГІЛКІ ЯК МЕСЦА ЗАХОЎВАННЯ ТРАДЫЦЫЙ

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЛІПЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 131 (28998)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Падчас перагавораў па ўступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю кожная краіна-ўдзельніца павінна пагадзіцца з тым, што новым членам СГА стане Беларусь. І на гэтым этапе самыя прынцыповыя перагаворшчыкі — ЗША і Еўрасаюз. На самай справе, мы ім удзячныя, таму што яны скрупулёзна падыходзяць па кожным пункце даклада рабочай групы, і для нашых дзяржорганаў гэта таксама плюс. Можа быць, на тыя рэчы, на якія мы глядзелі са свайго боку, нам дэманструюць погляд з іншага, каб пагладзець на тыя ці іншыя працэсы крышку інакш. Ужо заўтра мы наўрад ці ўступім у арганізацыю. У нас застаецца шмат пытанняў для абмеркавання, у тым ліку на самым высокім узроўні. Але папярэдні дэдлайн мы ўсё ж паставілі: гэта 12-я канферэнцыя СГА, якая пройдзе летам 2020 года ў Нурсултане».*

# ЯГАДНАЯ ДАРОГА





**Сям'я жыхароў вёскі Касары Ушацкага раёна — Людміла ЖАВАРАНАК, яе нявестка Алеся і ўнук Мікіта кожны дзень едуць у глыб лесу збіраць чарніцы. Ім не замінае далёкая дарога і нават дождж. Частку свайго ягаднага збору яны здаюць у нарыхтоўчы пункт дзікарослай лясной прадукцыі.**

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## КОРАТКА

• Міністэрствам аховы здароўя Беларусі правадзіцца работа па магчымым зніжэнні кошту некаторых лекаў.

• **У Пінску 13 ліпеня за гадзіну выпала больш за дэкадную норму ападкаў.**



• Помнік Напалеону Орду, пашкоджаны падчас урагану, адновяць у Іванаве Брэсцкай вобласці.

• **У Гомельскую дзіцячую абласную бальніцу падкінулі новароджаную дзяўчынку.**

ISSN 1990 - 763X

19131

Чвэрць стагоддзя 25

# «СЭРЦА» КРАІНЫ Б'ЕЦЦА ЎПЭЎНЕНА

**У фармат рубрыкі «Чвэрць стагоддзя» мы вырашылі ўнесці карэктывы. Калі дагэтуль у яе публікацыях расказвалася пра ажыццяўленне важных дакументаў, падпісаных кіраўніком дзяржавы, то цяпер размова пойдзе пра развіццё рэгіёнаў краіны за апошнія дваццаць пяць гадоў. Менавіта пасля ўтварэння інстытута прэзідэнцтва ў краіне пачала выбудоўвацца моцная вертыкаль улады, і гэта шмат у чым прадвызначыла рэгіянальную палітыку дзяржавы. Таму ў суразмоўцы мы запрасілі людзей, якія за вобласці адказваюць непасрэдна, — старшынь аблвыканкамаў.**

СТАР. 4–5

Культпаход

# Гульні ў хованкі, «ажыўшыя» карціны, дамашнія канцэрты...

**Як у Магілёўскай вобласці заахвочваюць наведвальнікаў у музеі**



**Захапленне, здзіўленне, натхненне — музей здольны разбудзіць у чалавеку шмат розных пачуццяў, але, каб іх адчуць, трэба яшчэ дайсці да гэтага музея. У некаторых раённых установах можна быць адзіным наведвальнікам за ўвесь дзень, калі не запланаваны візіт якой-небудзь арганізаванай групы з ліку школьнікаў або студэнтаў, якія прыходзяць замацаваць веды па пэўным перыядзе гісторыі. На жаль, чэргі, як у Эрмітаж або Траццякоўку, у нас не стаяць нават у абласныя музеі. І справа нават не ў тым, што там глядзець няма на што. Проста трэба неяк зацікавіць чалавека, абудзіць у ім прагу да ведаў, жаданне бачыць больш, чым проста экспанат. І музеі вобласці працуюць над гэтым, у тым ліку і з «асаблівымі» людзьмі. Бо яны яшчэ больш «закамплексаваныя», чым астатнія. Музейныя эксперыменты дапамагаюць ім адчуваць сябе ў жыцці больш упэўнена.**

СТАР. 8

## ПРЭЗІДЭНТ НА ГЭТЫМ ТЫДНІ НАВЕДАЕ РАСІЮ

**Рабочы візіт Аляксандра Лукашэнкі ў суседнюю краіну запланаваны на 17—18 ліпеня. У першы дзень прэзідэнты Беларусі і Расіі правядуць нефармальную сустрэчу.**

18 ліпеня ў Санкт-Пецярбургу кіраўнік Беларусі разам з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным прыме ўдзел у пленарным пасяджэнні VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. У цэнтры ўвагі — пытанні развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі. Будзе абмеркаванае і ўзаемадзеянне ў рамках Саюзнай дзяржавы.

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Спікер Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША абвінавaціла Трампа ў ксенафобіі



Спікер ніжняй палаты амерыканскага Кангрэса Нэнсі Пэлосі ў нядзелю абвінавaціла прэзідэнта краіны Дональда Трампа ў ксенафобіі.

Прэзідэнт ЗША раней у гэты ж дзень абрынуўся з крытыкай на «прагрэсіўных» жанчын-дэмакратаў з Кангрэса ЗША. «Так цікава бачыць, як «прагрэсіўныя» жанчыны-дэмакраты з Кангрэса, якія першапачаткова былі выхадцамі з краін, урады якіх з'яўляюцца поўнай і татальнай катастрофай, горшыя, самыя карумпаваныя і няўмелыя ў свеце, — калі ў іх наогул ёсць нармальны ўрад, — цяпер гучна і злосна расказваюць жыхарам ЗША, найвялікшай і самай моцнай нацыі на Зямлі, як кіраваць нашым урадам. Чаму б ім не паехаць назад і не дапамагчы выправіць цалкам разбураныя і наводненыя злачыннасцю месцы, адкуль яны прыехалі? А потым вярнуцца і паказаць, як гэта было зроблена», — напісаў ён на сваёй старонцы ў Twitter.

У адказ Пэлосі заявіла, што адхіляе гэтыя «ксенафобскія каментарыі, закліканыя падзяліць нацыю». «Замест таго, каб нападаць на членаў Кангрэса, ён павінен працаваць з намі над гуманнай міграцыйнай палітыкай, якая адлюстроўвала б амерыканскія каштоўнасці. Калі прэзідэнт Трамп кажа чатыром амерыканскім жанчынам-кангрэсменам вяртацца ў свае краіны, ён пацвярджае, што яго план «Зрабіць Амерыку зноў вялікай» заўсёды быў накіраваны на тое, каб зрабіць Амерыку зноў белай», — напісала Пэлосі ў сябе ў Twitter.

### Картэж Зяленскага трапіў у ДТЗ з калонай аўтобусаў з дзецьмі ў Запарожжы



Тры аўтамабілі з картэжу прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага сталі ўдзельнікамі ДТЗ у Запарожскай вобласці з калонай аўтобусаў, у якіх ехалі дзеці. Ніхто не пацярпеў. Пра гэта паведамляе партал «Страна.ua» са спасылкай на ўкраінскае ўпраўленне дзяржаўнай аховы (УДА).

Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай здарэння стаў абгон калоны аўтобусаў легкавымі аўтамабілямі. «Абганялі калону два Volkswagen Touareg з картэжу Зяленскага і аўтобус службы бяспекі прэзідэнта, — адзначылі «Стране.ua» ва УДА. — Яны вярталіся ў Кіеў, у той час як Зяленскі паляцеў у сталіцу на самалёце».

Крыніца выдання ва УДА таксама звязала аварыю з недахопам кіроўцаў аўтамабіляў, якія ўваходзяць у картэж украінскага лідара. Паводле яе даных, «з 30 кіроўцаў у штаце цяпер працуе палова. З-за недахопу кадраў і шчыльнага графіка кіроўцы не спяць суткамі. Адсюль і ДТЗ».

Прэзідэнт Зяленскі знаходзіўся з рабочай паездкай у Адэсе, дзе правёў нараду па пытаннях развіцця марскіх партоў Украіны.

### Суд Цюрыха пакараў пеўня за крыкі па начах

Суддзя ў Цюрыху вынес прысуд птушцы, якая занадта гучна кукарэкае па начах, паведамляе выданне Neue Zurcher Zeitung.

Жыхары горада падалі іск на мужчыну, які абсталяваў у сваім гаражы куратнік. Суседзі скардзіліся на тое, што певень па начах часта і гучна крычыць, замінаючы спаць. Каб даказаць суддзі слушнасць іх прэтэнзій, яны падалі даныя па колькасці «кукарэкаў» за ноч. Высветлілася, што за гадзіну певень крычыць ад 14 да 44 разоў з гучнасцю каля 85 дБ. Акрамя ўсяго іншага, суседзяў раздражняў непрыемны пах з гаража, і яны настойвалі, каб суд пастанавіў знесці куратнік. Суддзя прыняў рашэнне: гаспадар пеўня абавязаны з 22.00 да 8 раніцы забяспечыць цішыню. Для гэтага ён павінен пакідаць сваіх птушак без асвятлення. У сваю чаргу, куратнік ён можа пакінуць. Пастанова суда датычыцца толькі пеўня.

# САСЛУЖЫЦЬ ДОБРУЮ СЛУЖБУ

## Усё больш маладых людзей лічаць час, праведзены ў арміі, станоўчым досведам



**Андрэй РАЎКОЎ і Ігар КАРПЕНКА знаёмяцца з бытам «Прызыўніка».**

Фота БелТА.

Апошнія некалькі гадоў ва Узброеных Сілах пры звальненні ў запас вайскоўцы анкетуюцца. **Міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ** адзначыў пазітыўныя вынікі гэтых апытанняў. Так, летась 84 % хлопцаў адказалі, што служба дала ім нешта станоўчае ў жыцці. Сёлета лічба задаволеных перавысіла 90 %. Каля 72 % у мінулым годзе адзначылі, што служба дазволіла вызначыцца з жыццёвымі мэтамі, — сёлета такіх ужо 80 %.

Па словах Андрэя Раўкова, сёння чацвёра з пяці маладых людзей згаджаюцца, што армія — школа мужнасці і патрыятызму. Абсалютная большасць хлопцаў лічаць, што сталі больш трывалыя, моцныя, рашучыя, самастойныя, навучыліся працаваць у калектыве і разумець таварышаў.

Пра гэта міністр абароны паведаміў журналістам падчас наведвання 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння, дзе працуе лагер «Прызыўнік». Азы жыцця ў палявых умовах асвойваюць навучэнцы Магілёўскага дзяржаўнага спецыяльнага прафесійна-тэхнічнага вучылішча закрытага тыпу № 2 дрэваапрацоўкі.

«Падцягваюся 15 разоў і разбіраю аўтамат за 15 секундаў — гэта адзнака «выдатна», — **выхаванцу лагера Аляксею КУЦАЕВУ** будзе чым пахваліцца перад аднагрупнікамі на апошнім курсе вучылішча. Таварышы, хто не трапіў у «Прызыўнік», кажа, потым не хаваюць зайздрасці. Яшчэ б: дзе атрымаеш «майстар-клас» па аўтамаце Калашнікава ад генерал-лейтэнанта — Андрэй Раўкоў не пашкадаваў часу і падзяліўся з хлопцамі сакрэтамі майстэрства.

У будучага прызыўніка Аляксея Куцаева і брат, і сябар служылі ў ПДВ. Аляксей і сам марыць прызвацца ў спецназ — асабліва пасля таго, як на свае вочы пабачыў элітную брыгаду.

«Спачатку галоўнае — на тэрміновую каб удалося трапіць: адбор жа сур'ёзны. А там і на кантракт можна заставацца», — будуе жыццёвыя планы хлопец.

Перад сустрэчай з выхаванцамі лагера міністры абароны Андрэй Раўкоў і адукацыі Ігар Карпенка ўсклалі кветкі да помніка воінам, якія праявілі масавы гераізм у гады Вялікай Айчыннай вайны. Шаноўным госцем сустрэчы стаў пачэсны салдат часці Генадзь Юшкевіч — ветэран не страціў хлапечага азарту і з цікавасцю абмяркоўваў з афіцэрамі перавагі і недахопы розных відаў зброі.

### Абарона — усенародная

Самай важнай і складанай задачай дзяржавы міністр абароны Андрэй Раўкоў лічыць выхаванне патрыёта. Задачы па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі выконваюць і Узброеныя Сілы — і не толькі моладзі, але ўсіх грамадзян краіны.

«Можа, гэта казённыя словы, але задачы, важнейшай за выхаванне патрыёта, у дзяржавы няма, таму што калі мы гаворым пра незалежнасць, суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць, захаванне канстытуцыйнага ладу, пра мір і бяспеку ў дзяржаве, зразумела: да гэтага патрэбна прыкласці шмат намаганняў. Дзяржава робіць усё, каб абарона Айчыны была ўсенароднай», — упэўнены кіраўнік ведамства.

Узброеныя Сілы арганізуюць лагеры для часткі насельніцтва, якая, мабыць, больш за ўсіх патрабуе выхавання, — моладзі. У яе ліку і школьнікі, і «складаныя падлеткі». За дзесяць гадоў ваенна-патрыятычным выхаваннем у лагерах было ахоплена больш за сто тысяч падлеткаў.

«Думаю, для іх гэта карысна і павучальна, таму што чалавек, які сутыкнецца з воінскім калектывам у юным узросце і адчуе тыя складанасці, якія зазнае малады чалавек у тым ліку на тэрміновай службе, лягчэй адаптуецца потым, калі будзе прызваны. Са свайго боку мы робім усё, каб пад кіраўніцтвам дасведчаных сяржантаў і афіцэраў хлопцы ўжо цяпер атрымалі пэўныя навыкі: навучыліся распальваць вогнішча, аказваць элементарную медыцынскую дапамогу», — Андрэй Раўкоў робіць акцэнт на карыснасці, практычнасці армейскіх уменняў.

Таму, звяртаючыся да маладых людзей, ён звярнуў іх увагу на галоўнае ў жыцці пытанне: «Хто я, кім хачу быць». Хтосьці знойдзе адказ менавіта тут, у ваенна-патрыятычным лагеры, і нават зробіць выбар прафесіі.

«Канешне, мы хочам, каб яны былі здаровы, каб былі ў першую чаргу людзьмі і, натуральна, прайшлі армейскую школу і былі гатовыя, калі раптам надыдзе час, стаць у шыхт са зброяй і абараніць сваю краіну», — падвёў вынік міністр.

### На суседніх кафедрах

Абодва міністэрствы — і адукацыі, і абароны — згаджаюцца, што дапрызыўная падрыхтоўка патрабуе ўдасканалення. На думку апытаных дэмабілізаваных, яе павінны праводзіць тыя, хто сам служыў.

**Міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** расказаў журналістам, як дапрызыўная падрыхтоўка зменіцца згодна з патрабаваннямі часу.

«Трэба ў школе павысіць статус ваенрука, даабсталяваць цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі. Акрамя таго, ужо падрапраўлі нарматыўныя дакументы, звязаныя з дзейнасцю ваенна-патрыятычных класаў. Сур'ёзная ўвага надаецца і кадэцкай адукацыі. Больш за тое: распрацаваны факультатыў для 8—9 класаў па ўводзінах у дапрызыўную падрыхтоўку», — адзначыў міністр.

Ён падкрэсліў, што служба ў арміі — не перашкода атрыманню адукацыі.

«У краіне для гэтага створаны ўсе ўмовы: у сістэме адукацыі каля 12 ВНУ маюць спецыялізаваныя факультэты і ваенныя кафедры. Распрацаваны праект Указа кіраўніка дзяржавы аб сеткавай падрыхтоўцы, згодна з якім навучэнцы ВНУ без ваенных кафедраў будуць мець магчымасць займацца ў найбліжэйшых установах, дзе такія кафедры ёсць», — паведаміў Ігар Карпенка.

Па яго словах, распрацоўваецца і дакумент, які дазволіць дапасаваць вучэбныя заняткі да праходжання службы ў рэзерве — гэта важна для выпускнікоў ВНУ, якія жадалі б працягнуць вучобу ў магістратуры. Да таго ж, нагадаў міністр адукацыі, магістратура — неабавязковая ступень адукацыі, яна для матываваных людзей.

«Выпускнікоў гэтага года 56 тысяч, месцаў у магістратуры — усяго тры тысячы. Плюс вазьміце нейкую колькасць дзяўчат», — па словах Ігара Карпенкі, турбавацца, што ў краіне не застанецца магістрантаў, няма падстаў.

Ён згадзіўся, што ў грамадстве маглі скласціся пэўныя стэрэатыпы і страхі — для таго і патрэбныя падобныя лагеры, зборы, наведванні воінскіх часцей (можа, у большай ступені гэта актуальна нават для бацькоў). Па інфармацыі кіраўніка адукацыйнай сістэмы, абодва міністэрствы знаходзяць паразуменне, як выбудаваць працу для вырашэння задач і арміі, і адукацыі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

*г. Мар'іна Горка.*

Нерухомасць

# АМАЛЬ ГАТОВУЮ СЯДЗІБУ — ЗА ПАЎЦАНЫ І НАВАТ ТАННЕЙ

**На любы густ і колер прапануецца дзяржнерухомасць, якая не выкарыстоўвалася, у Мінскай вобласці. Цяпер яе можна набыць на аўкцыёнах з магчымасцю задзейнічання пад жыллё.**

Сёлета ў цэнтральным рэгіёне краіны плануецца ўцягнуць у гаспадарчы абарот шляхам продажу на аўкцыённых таргах больш за 100 нявыкарыстаных аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці. Частку з іх прапануецца набыць з магчымасцю пераводу ў жылыя памяшканні, паведамілі спецыялісты камітэта «Мінскаблмаёмасць».

Жыхарамі шумнага Мінска гэты варыянт разглядаецца як спосаб знізіць высокі тэмп гарадскога жыцця. І сталічны рэгіён у плане змены лакацыі па-ранейшаму лічыцца прывабным.

На таргах, якія праводзяцца камітэтам, ужо цяпер можна набыць больш за 20 такіх аб'ектаў, размешчаных у маляўнічых месцах Мінскай вобласці паблізу рэк, азёраў і лясоў. Пад перспектыўнае жыллё прапануюцца аднапавярховыя будынкі, якія ў мінулым былі сельскімі школамі, майстэрнямі, сталоўкамі ды іншымі адміністрацыйнымі аб'ектамі. Жылая плошча большай часткі гэтых будынкаў складае ад 150 да 280 квадратных метраў, плюс зямельны ўчастак не менш чым 20 сотак у працяглую арэнду, што дазваляе стварыць уласную сядзібу.

Як вядома, заканадаўствам устаноўлены гнуткі механізм паніжэння пачатковай цаны аб'ектаў дзяржуласнасці. Па шэрагу будынкаў пачатковая цана іх продажу ўжо паніжана на 80 працэнтаў, так што за асобныя аб'екты такой нерухомасці просяць усяго толькі ад пяці да пятнаццаці тысяч рублёў. Аўкцыённыя таргі з'яўляюцца адкрытымі. Прыняць удзел у іх або прысутнічаць пры іх правядзенні можа любы ахвотны. Падрабязную інфармацыю можна атрымаць на сайце камітэта www.gki.gov.by.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Базарны дзень

# КАЗКА ПРА РЭКОРДНАГА ПАВУКА І САЛАМЯНАГА БЫЧКА


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Быць у Віцебску на «Славянскім базары» і не пабываць у Горадзе майстроў — недаравальна. Тым больш сёлета тут прайшлі ажно чатыры конкурсы сярод прадстаўнікоў народных мастацкіх рамёстваў: «Салавейка» — па вырабе традыцыйнай свісцёлкі, «Ажурныя мары» — па выцінанцы, «Папараць-кветка» — па саломапляценні і «Віцебская мазаіка» — па шыцці з абрэзкаў.**

Кожны ахвотны мог не толькі ўбачыць, як нараджаюцца новыя шэдэўры народнай творчасці, але і паўдзельнічаць у іх стварэнні на майстар-класах. А якасць і колькасць свісцёлак упершыню можна было ацаніць, напрыклад, у зводным «Салаўіным гаі» — дзясяткі выканаўцаў на водных свісцёлках выступілі хорам на віцебскай плошчы Свабоды.

У межах праекта «Беларуская гасцінаасць» у Горадзе майстроў усе раёны вобласці па чарзе прадстаўлялі нацыянальную беларускую кухню і свае адметныя мерапрыемствы, а таксама нематэрыяльныя каштоўнасці Віцебскага рэгіёна.

На конкурсе «Папараць-кветка» правялі сапраўдны флэшмоб: усе майстрыхі разам пад кіраўніцтвам вопытнай Наталлі Сцержанковай з гарадскога пасёлка Шуміліна плялі амаль паўтараметровага саламянага павука. Саламяныя павукі — мастацкая з'ява, зазначае кіраўнік Віцебскага абласнога цэнтра народнай творчасці Кацярына Лабука. Яны распаўсюджаныя толькі ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Гэтыя канструкцыі, сабраныя, як павуцінне, з мноства аднолькавых частак-модуляў, здаўна мелі ахоўную функцыю: іх вешалі на покуці або над калыскай.

Зрэшты, прадставілі свае цікавыя напрацоўкі і іншыя майстры з усіх дамоў рамёстваў і клубаў народных майстроў Віцебшчыны, а таксама госці — рамеснікі з Расіі, Украіны, Літвы. Вышываныя ручнікі, гаманцы і нават гальштукі-бабачкі ў народным стылі, вырабленыя з лазы калыскі і кошыкі, керамічны посуд, падсвечнікі і абярэгі, плеценыя з саломы маленечкія дамавікі і гіганцкія коні (аднаго такога арганізатары падарылі ўдзельніцы конкурсу маладых выканаўцаў Паўліне з Літвы), тканыя паясы, разнастайная выцінанка — разетквая (як прыклад — усім вядомыя сняжынкі), ажурная, рапортная (гэта калі загатоўка складваецца гармонікам, а ўзор такім чынам паўтараецца)...

— Колькі трэба часу, сіл і саломкі, каб зрабіць аднаго саламянага павука? — распытваем майстрых з шумілінскага клуба народных майстроў «Спадчына».

— Гледзячы якога. На вялікага я два тыдні толькі наразала салому, і яшчэ столькі б збірала, каб рабіла адна. А калі мы ўсе разам з дзяўчатамі, то вядома, выходзіць хутчэй, — не перарываючы карпатлівай работы, праводзяць для нас «лікбез» шумілінскія кабеты. — Нарыхтоўваем салому адзін раз у год, летам: жалі, высушылі як след, каласы абрэзалі і ставім на захоўванне, а потым бяром колькі трэба.

Віктар Гарбачоў з Докшыцкага раённага дома рамёстваў не без гонару расказвае пра свае работы, якія мы неафіцыйна празвалі «дыетычнымі карцінамі», калі вока бачыць разнастайную смакату, а на зуб яна не трапляе. На адмысловых аб'ёмных карцінах, выразаных з дрэва, — хлеб ды сала, ды каўбасы... Ну, вы разумееце, як цякуць слінкі ў гледачоў. «Як пачаў такія карціны рабіць? Ведаеце, за пяць гадоў пахадзіў, паглядзеў, што хто з майстроў прывозіць: усяго ёсць на «базары», а такой працы ніхто не робіць, — разважае майстар. — Бо трэба быць не толькі рамеснікам, але і мастаком, выбудаваць кампазіцыю, падабраць колер. Таму мае работы пазнавальныя, і на іх не толькі глядзяць, але і купляюць». Фатаграфуем на памяць жарт майстра — мясарубку «Зінгер» — і ідзём далей.

...І ледзьве не натыкаемся на бычка Сцёпу, зробленага з пасмаў ільну і асобных саламяных элементаў. Бычок разам са сваімі гаспадарамі прыехаў з Пастаў — як кажуць майстры, рабілі яго тры тыдні, скарыстоўваючы шаблоны дзесяцігадовай даўніны. Стваральнікі бычка, дарэчы, прыдумалі новую фестывальную традыцыю і склалі заахвочвальны вершык, які з усмешкай чытаюць мінакі: «Каб Сцёпу дагадзіць, трэба грошык палажыць. За вушкам часаць можна — будзеш жыць заможна. Памацаеш бачок — здароўе дасць бычок. Патрымаеш за рогі — сыдуць ворагі з дарогі... А калі хвост пакруціш, любую справу замуціш!» У капялюшыку побач са Сцёпам ужо блішчаць манеткі. Не ўтрымаліся і карэспандэнты «Звязды», пачасалі Сцёпу за вушкам, а раптам спраўдзіцца прыкмета ад ільнянога бычка?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ПЕСНЯ НЕ РАЗВІТВАЕЦЦА З ВАМІ

**У ноч з 15 на 16 ліпеня адбылося ўрачыстае закрыццё XXVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Сталі гісторыяй віртуальны музей ансамбля «Песняры», які адкрылі дзеці Уладзіміра Мулявіна, выступленне легендарных салістаў з сучасным калектывам, першы афіцыйны танцавальны конкурс Dream Dance Fest і выступленні на ім больш чым 130 калектываў з сямі краін, цыркавое шоу «Вясёлка на шаўковым шляху» з кітайскай правінцыі Шэньсі і прадстаўленні Дзяржаўнага балета на лёдзе Санкт-Пецярбурга, вялікі КВЗ-канцэрт і міжнароднае свята харавой музыкі «Славянскі дабравест», джазавыя ночы і чатырохгадзінны марафон маладзёжных куміраў на досвітку, шматлікія сольныя і зборныя канцэрты вядомых артыстаў і калектываў, разнастайныя мастацкія выстаўкі, аншлагавыя спектаклі ў «Лялечным квартале», начныя вогненныя шоу і новы рэкорд фэсту вулічнага мастацтва «На сямі ветрах» — тысяча пацалункаў на Пушкінскім мосце.

**Учора ж стала вядома, як размеркаваліся прызавыя месцы ў міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў «Віцебск-2019».**

Лідарам конкурсу сёлета стаў **прадстаўнік Казахстана Адзільхан МАКІН** — у яго 178 балаў, спецпрыз «Ліра» і Гран-пры памерам у 20 тысяч долараў.

Адзільхану 24 гады, ён выпускнік Казахскага нацыянальнага ўніверсітэта мастацтваў, стыпендыят Еўразійскага фонду культуры і лаўрэат шэрагу міжнародных конкурсаў. Сваю перамогу ён прысвяціў роднай краіне і ўсяму народу. «Што я адчуваю? Неверагоднае шчасце!» — усміхаецца спявак.

Два артысты — **Георгій ПУТКАРАДЗЭ з Грузіі і Ілай з Ізраіля** — набралі аднолькавую колькасць балаў, па 171. Аднак, паводле палажэння, першая прэмія конкурсу не можа быць падзеленая, а таму І прэмія і 15 тысяч долараў — у Георгія, а Ілай на прыступку ніжэй, у яе ІІ прэмія і 5 тысяч долараў.

**Прадстаўнік Беларусі Ваня ЗДАНЮК** на старце конкурсу падзяліўся: «Спадзяюся ўбачыць першы нумар, які мне дастаўся, яшчэ раз — напрыканцы». Але не ўгадаў. Беларус, які набраў 170 балаў, адзначаны ІІ прэміяй, «Лірай» і грашовым прызам у 5 тысяч долараў. ІІІ прэмія таксама знайшла адразу дваіх уладальнікаў: **Іван ДЗЯТЛАЎ з Расіі і Дзмітрый БАБАК з Украіны** атрымалі па 2,5 тысячы долараў кожны.

Зрэшты, цырымонія закрыцця мастацкага форуму не азначае апошнюю кропку. Сёння ў Віцебску яшчэ пройдуць музычны спектакль «Дзіцячы альбом» Чайкоўскага, камедыя «Клінічны выпадак» і «Даеш Шэкспіра!» ад Маскоўскага тэатра на паўднёвым захадзе, канцэрты Віктара Каралёва і «Шансон-ТБ — усе зоркі», а заўтра канчаткова перагорнуць 28-ю фестывальную старонку рокеры — гурт «Кіпелаў». А потым цэлы год горад будзе жыць у чаканні наступнага фэсту. А госці і артысты з многіх краін свету, ад'язджаючы дадому, мабыць, паўтораць следам радкі з нядаўняга паэтычнага перформанса: «І ногі мае ўдзячныя кедам, якія ў Віцебск мяне прывялі»...

Да сустрэчы ў наступным годзе — на тым жа месцы, у той жа час!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Надвор'е

# Пацяплее толькі да выхадных

Калі ў сераду ўдзень максімум 22 цяпла, у нядзелю ўжо да плюс 29 градусаў

**На працягу рабочага тыдня будзе пераважна халаднавата з дажджамі, толькі да выхадных надвор'е палепшыцца і пацяплее, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А сёння ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі ў асобных раёнах навальніцы. Тэмпература ўдзень будзе ад плюс 19 да плюс 25 градусаў. На наступны дзень, 17 ліпеня, надвор'е ў нас будуць вызначаць атмасферныя франты цыклону, шлях якога пройдзе ўздоўж паўночна-ўсходніх межаў краіны. Чакаецца пераважна воблачнае надвор'е, часам пройдуць дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы.

І ў чацвер чакаецца няўстойлівае надвор'е, часам дажджы рознай інтэнсіўнасці. Удзень дажджы будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да 14 градусаў, удзень чакаецца ад 15 цяпла па паўночным усходзе да плюс 23 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. А вось у пятніцу надвор'е пачне злёгку паляпшацца, але месцамі не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы туман. Уначы будзе плюс 8—15 градусаў, удзень прагназуецца ад 17 градусаў па паўночным усходзе да 26 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу і нядзелю надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску і цёплая няўстойлівая паветраная маса. Уначы пераважна без ападкаў, а ўдзень у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература ў начны час складзе 9—16 цяпла, удзень у суботу — ад 20 градусаў да плюс 27 градусаў, у нядзелю — 22—29 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# АД АБАБУРКІ ДА ЯСКЕВІЧА

**У «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» задуманы новы творчы праект, прысвечаны класіку беларускай літаратуры Уладзіміру Сямёнавічу Караткевічу (1930—1984).**

Энцыклапедысты сумесна з вучонымі-літаратуразнаўцамі плануюць падрыхтаваць і выдаць персанальную энцыклапедыю «Уладзімір Караткевіч». Рэалізацыя праекта прымеркавана да 90-годдзя з дня нараджэння класіка, якое Беларусь будзе адзначаць у лістападзе 2020 года. Варта нагадаць, што «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» ў розныя гады, пачынаючы з 1986-га, выдала некалькі персанальных энцыклапедый: «Янка Купала» (калі першая была ў адным томе, то другое выданне — ужо ў трох), «Францыск Скарына», «Максім Багдановіч». Між іншым, персанальных энцыклапедый не так ужо і шмат на постсавецкай прасторы. Да 1991 года іх увогуле было, акрамя «купалаўскай», усяго толькі дзве — «М. Ю. Лермантаў» і «Т. Р. Шаўчэнка».

Складзены ўжо і слоўнік энцыклапедыі «Уладзімір Караткевіч». Пакуль што ён налічвае 656 тэрмінаў, якія пасля стануць артыкуламі энцыклапедыі. Ад Абабуркі да Яскевіча — такі прасцяг будучага выдання. Мовазнавец Мікалай Васілевіч Абабурка вывучаў эмацыянальна-экспрэсіўную лексіку ў творах беларускіх празаікаў, у тым ліку — і ў прозе Уладзіміра Караткевіча. Літаратуразнавец Алесь Яскевіч — таксама з шэрагу даследчыкаў творчасці аўтара «Каласоў пад сярпом тваім». Пад адной вокладкай знойдзецца месца матэрыялам, прысвечаным раманам, аповесцям, апавяданням, нарысам, вершам, п'есам У. Караткевіча, мастакам і кампазітарам, якія прычыніліся да яго творчасці, мясцінам, якія звязаны з жыццём класіка, дзе ён быў у адпачынку, спыняўся ў знаёмых і сваякоў, куды ездзіў па запрашэнні сяброў.

— Да работы над персанальнай энцыклапедыяй мы запрасілі вялікі атрад навукоўцаў, пісьменнікаў, музейшчыкаў і архівістаў, — расказвае **дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.** — Доктар філалагічных навук Аляксей Ненадавец, кандыдат мастацтвазнаўства Галія Фатыхава, дактары філалагічных навук Вячаслаў Рагойша, Іван Штэйнер, бібліятэкары, архівісты — вось кола дзясяткаў аўтараў, якія ўжо пачалі работу для нашага выдання. Мы вельмі спадзяёмся, што яно стане добрым унёскам у айчыннае караткевічазнаўства, пакажа не толькі ўзровень, якога дасягнулі даследаванні жыцця і творчасці легендарнага беларускага пісьменніка, але і выбудуе новыя дарогі да засваення зробленага, здзейсненага ў імя сваёй Айчыны Уладзімірам Сямёнавічам Караткевічам.

Мяркуецца, што персанальная энцыклапедыя будзе багата ілюстравана карцінамі, прысвечанымі пісьменніку, рэпрадукцыямі з кніжнай графікі да твораў У. Караткевіча, а таксама фатаграфічнымі матэрыяламі.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# «СЭРЦА» КРАІНЫ

## Кіраўнік Мінскай вобласці — аб тым,

**Першае інтэрв'ю нашага праекта — са старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Анатолем ІСАЧАНКАМ. Міншчына — самы цэнтр краіны, яна нават сваімі абрысамі нагадвае сэрца. З цэнтральнага становішча вобласці мы і пачалі гутарку.**



**— Анатоль Міхайлавіч, сталічны рэгіён заўсёды быў своеасаблівым індыкатарам таго, што адбываецца ў краіне. Менавіта таму серыю інтэрв'ю з кіраўнікамі абласцей для рубрыкі «Чвэрць стагоддзя» мы вырашылі пачаць менавіта з Міншчыны. Калі б давялося аналізаваць па прынцыпе «Было — стала», якія змены ў сацыяльна-эканамічным становішчы вобласці цягам апошніх 25 гадоў вы адзначылі б найперш?**

— Каб як след адказаць на гэтае пытанне, спатрэбіцца напісаць кнігу. Але мы абмежаваныя рамкамі інтэрв'ю, таму многія знакавыя моманты давядзецца апусціць. Спынюся толькі на некаторых. Напэўна, самае галоўнае, пра што трэба сказаць, — узровень жыцця народа. У Мінскай вобласці за апошнія 25 гадоў рэальная зарплата ў сярэднім вырасла ў дзевяць разоў. Пры гэтым забяспечваўся і працягвае існаваць цэлы шэраг сацыяльных гарантый. Бясплатнымі застаюцца медыцына і адукацыя, якія адначасова прапануюць і платныя паслугі. Да гэтага часу дзяржава ў значнай ступені датуе камунальныя плацяжы, праезд у грамадскім транспарце, харчаванне школьнікаў і месцы ў дзіцячых садках. Існуе даступная для кашалька бацькоў сістэма дзіцячых лагераў. Каласальныя сродкі ўкладзеныя дзяржавай у будаўніцтва льготнага жылля для розных катэгорый грамадзян. Гэтыя факты, якія адлюстроўваюць сацыяльную накіраванасць нашай унутранай палітыкі, можна называць доўга.

Сёння часта параўноўваюць узровень даходадаў людзей у Беларусі і за яе межамі. Але пры гэтым замоўчваюць структуру выдаткаў сем'яў у так званых шчаслівых краінах. Там многія жыццёва важныя рэчы абыходзяцца значна даражэй.

Калі працягнуць тэму жыллёвага будаўніцтва, то можаце параўнаць. У 1994 годзе на Міншчыне было здадзена ў эксплуататацыю ўсяго каля 466 тысяч квадратных метраў жылплошчы. Летась гэтая лічба была амаль у два з паловай разы большай. Палічыце, колькі ў сярэднім жылля ўзведзена за чвэрць стагоддзя.

Прыкметна вырасла прамысловая вытворчасць — у 6,3 раза. Гэта стала вынікам масавай рэканструкцыі і пераўзбраення індустрыяльных аб'ектаў. У тым ліку такіх, як ААТ «БелАЗ». У апошнія гады лінейка прадукцыі прадпрыемства папоўнілася машынамі новага класа. Сярод іх — унікальны самазвал грузападымальнасцю 450 тон.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не адставала і сельская гаспадарка. Вазьміце хоць бы такія даныя: вытворчасць цукру павялічылася ў 4,6 раза, цукровых буракоў — у 6,4 раза, малака — удвая. Больш чым у два разы рэалізуецца жывёлы і птушкі на забой.

Мадэрнізаваны і аснашчаны найноўшым тэхналагічным абсталяваннем жывёлагадоўчыя і іншыя аб'екты. Толькі за апошнія некалькі гадоў на Міншчыне пабудаваны і рэканструяваны 185 фермаў, комплексаў, іншых вытворчых памяшканняў падобнага тыпу.

Значна абноўлены парк сельгастэхнікі. У нашай вобласці толькі летась закуплена 1117 адзінак сельскагаспадарчых машын і абсталявання — трактароў, камбайнаў, грузавікоў і г. д.

Акрамя таго, праведзена тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемстваў перапрацоўчай прамысловасці і аптымізавана іх колькасць.

Сведчаннем правільнасці абранага эканамічнага курсу служыць тое, што Беларусь у самыя кароткія тэрміны забяспечыла сваю харчовую бяспеку.

Цяпер сельгаспрадпрыемствы разам з індустрыяльным комплексам павышаюць наш экспартны патэнцыял. Напрыклад, летась Мінская вобласць прадала за мяжу тавараў больш чым на сем мільярдаў долараў. Гэта ў сем разоў больш, чым дваццаць гадоў таму. А калі казаць пра экспарт паслуг, то ён за той жа перыяд узрос у 20 разоў.

Важна і тое, што з таго часу значна палепшылася сальда знешняга гандлю рэгіёна. А яго геаграфія пашырылася на 70 краін. Нашу прадукцыю купляюць ва ўсіх частках свету.

Асабліва высокімі тэмпамі развіваецца супрацоўніцтва з Кітаем. Узровень гандлю з ім павялічыўся ў 12 разоў. КНР стала для нас другім пасля Расіі гандлёвым партнёрам.

**— Напэўна, дасягненні вымяраюцца не толькі вытворчасцю прадукцыі і яе рэалізацыяй?**

— Безумоўна. Далёка наперад ступіла і сацыяльная сфера. Асабліва медыцына. Нашы спецыялісты дэманструюць высокія вынікі ў такіх складаных кірунках, як хірургія, у тым ліку пластычная, траўматалогія, артапедыя і ўралогія, фармакалогія і тэрапія. У цяперашні час у адной Мінскай абласной клінічнай бальніцы штогод робяць да 200 аперацый на адкрытым сэрцы. Імкліва развіваецца лапараскапія, пратэзаванне. Спецыялісты кожнай цэнтральнай раённай бальніцы Мінскай вобласці маюць магчымасць атрымаць кансультацыю вопытных прафесараў і практыкаў з дапамогай тэлемедыцыны. Гэта стала вынікам таго, што ўстановы аховы здароўя вобласці актыўна ўкараняюць лічбавыя тэхналогіі, асвойваюць дарагое высокатэхналагічнае абсталяванне. Раней пра гэта можна было толькі марыць.

Шмат цікавага адбываецца ў сферы адукацыі. У рэгіёне за чвэрць стагоддзя пабудаваны больш за паўсотні сучасных школ і дзіцячых садкоў, старыя — актыўна абнаўляліся. Дзеці з малых гадоў далучаюцца да новых тэхналогій. Напрыклад, ужо пачынаючы з пачатковай школы яны з дапамогай вопытных педагогаў займаюцца канструяваннем робатаў.

Створаны такія выдатныя навучальныя ўстановы, як, напрыклад, Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй і Мінскае абласное кадэцкае вучылішча. Дзейнічае зладжаная сістэма каледжаў і ліцэяў, якая цалкам забяспечвае патрэбы рэгіёна ў спецыялістах і рабочых кадрах. У тым ліку для новых вытворчасцяў, такіх як ААТ «БелДжы».

Нямала ўвагі аддаецца развіццю культуры. Можна адзначыць, што за апошнія гады рэалізаваны такія маштабныя праекты, як будаўніцтва Палаца культуры і амфітэатра ў Маладзечне, Палаца культуры ў Старых Дарогах, Дома культуры ва Уздзе, школы мастацтваў у Любані. У многіх месцах узведзены новыя клубы. А колькі ўстаноў падобнага тыпу было рэканструявана і адрамантавана! Палацава-паркавы комплекс у Нясвіжы, Свята-Уваскрасенскі кафедральны сабор у Барысаве, Храм Свяціцеля Мікалая Цудатворца ў Станькаве, будынак былога дваранскага сходу ў Слуцку і многае іншае.

За апошнія гады Міншчына ператварылася ў сапраўдны фестывальны край. Дастаткова сказаць пра штогадовае правядзенне такіх буйных культурных форумаў, як Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, міжнародны конкурс джазавай і эстраднай музыкі ў Салігорску.

Гонарам Міншчыны з'яўляюцца адроджаныя народныя традыцыі. Напрыклад, унікальны абрад пад назвай «Цары» ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна ўключаны ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны



ЮНЕСКА. Там жа значацца і ўрачыстасці ў гонар абраза Будслаўскай Божай Маці.

Нельга не сказаць пра развіццё спартыўнай інфраструктуры. З'явілася шмат новых аб'ектаў, такіх як Барысаў-арэна, лядовы палац у Маладзечне, фізкультурна-аздараўленчы комплекс і лыжная траса ў Плешчаніцах, гарналыжны цэнтр у Сілічах, шэраг іншых. Не кажу пра тое, што яшчэ большая колькасць стадыёнаў, арэн, манежаў была рэканструявана з улікам патрабаванняў часу. На тэрыторыі вобласці знаходзяцца знакавыя аб'екты, абсталяваныя для правядзення самых прэстыжных міжнародных спаборніцтваў. Сярод іх — рэспубліканскія цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі ў Раўбічах (па зімовых відах спорту) і Ратамцы (па конным спорце), вяслярны канал у Заслаўі, на якім праходзілі спаборніцтвы II Еўрапейскіх гульняў. Уся гэта велізарная гаспадарка патрабуе належнага абслугоўвання.

Увага да развіцця спорту на Міншчыне прыносіць добрыя вынікі. Напрыклад, летась атлеты рэгіёна заваявалі 89 медалёў чэмпіянатаў свету і Еўропы, маладзёжных і юніёрскіх першынстваў. Барысаўскі БАТЭ стаў чэмпіёнам Беларусі па футболе, мужчынская каманда «Шахцёр» з Салігорска выйграла нацыянальнае першынства па валейболе, жаночая дружына «БНТУ-БелАЗ» заняла верхнюю прыступку п'едэстала гандбольнага чэмпіянату рэспублікі. Добра выступілі нашы атлеты і на II Еўрапейскіх гульнях. У скарбонку краіны яны прынеслі чатыры залатыя, пяць сярэбраных і тры бронзавыя ўзнагароды. На п'едэстал падняліся прадстаўнікі бокса, вольнай барацьбы, самба, мастацкай гімнастыкі, веславання, лёгкай атлетыкі.

Як я ўжо адзначыў, гэта толькі некаторыя факты з найноўшай гісторыі Мінскай вобласці. На жаль, няма магчымасці расказаць пра многае іншае. Хачу выказаць глыбокую ўдзячнасць працоўным калектывам, якія сталі галоўнымі вяршыцелямі нашых перамог у розных сферах жыцця. Асаблівая ўдзячнасць прадстаўнікам кіруючага корпуса, якія працуюць актыўна і адказна. Выканаўчыя органы рэгіёна былі і застаюцца найважнейшымі звёнамі вертыкалі ўлады, якую стварыў Прэзідэнт. Сістэма дзяржаўнага кіравання дзейнічае зладжана і без збояў. Гэта з'яўляецца вызначальным фактарам у падтрыманні міру і стабільнасці ў Беларусі.

**— Адметнай рысай найноўшай гісторыі рэспублікі з'яўляецца тое, што тут імкнуцца захаваць усё найлепшае з той сістэмы, якая была ў СССР. У прыватнасці, на прадпрыемствах ляжыць немалая сацыяльная нагрузка...**

— І гэта правільна. А хіба было б справядліва, калі б такія гіганты, як «Беларуськалій» або БелАЗ, якія ствараліся ўсім народам, ні з кім не дзяліліся сваімі даходамі?

**— Ці можна падрабязней, якую менавіта сацыяльную місію яны выконваюць?**

— Возьмем той жа «Беларуськалій». Цяжка нават пералічыць, колькі ў яго кірункаў дзейнасці, акрамя асноўнага. Напрыклад, ён будуе шмат жылля. Толькі за апошнія чатыры гады здадзены два дамы на 120 і 160 кватэр. Акрамя таго, у прадпрыемства цэлая сетка інтэрнатаў, якія ён утрымлівае. Нядаўна адзін з іх пасля глабальнай рэканструкцыі ператварыўся ў сучасны 170-кватэрны арэндны дом. Цяпер праводзіцца рэканструкцыя яшчэ аднаго інтэрната.

Летась калійшчыкі рэалізавалі маштабны сацыяльны праект па рэканструкцыі гасцінічнага комплексу «Алеся», у тым ліку аднайменнага кафэ.Прадпрыемства ўзводзіць дзіцячыя сады-яслі, а пару гадоў таму пабудавала цэнтр развіцця дзіцяці «Планета дзяцінства» на 330 месцаў.

Дадайце да гэтага арганізацыю санаторна-курортнага лячэння для тысяч працоўных, медыцынскую дапамогу ў ведамаснай паліклініцы на 500 наведванняў у змену.

А таксама тое, што «Беларуськалій» — генеральны спонсар хакейнага і футбольнага клубаў «Шахцёр», якія дэманструюць вельмі годныя вынікі гульні.

Прадпрыемства прымала актыўны ўдзел ва ўзвядзенні кафедральнага сабора Раства Хрыстова ў Салігорску. Яно наогул аддае вялікую ўвагу добраўпарадкаванню горада. Рамантуе дваровыя тэрыторыі, дзіцячыя пляцоўкі, архітэктурныя формы. У цяперашні час разам з іншымі арганізацыямі шчыльна занята фінансаваннем работ па праектаванні і добраўпарадкаванні гарадскога сквера.

Усё гэта робіцца адначасова з рашэннем галоўнай задачы — нарошчваннем аб'ёмаў і пашырэннем асартыменту прадукцыі. Акцыянернае таварыства ўтрымлівае пазіцыі аднаго з найбуйнейшых вытворцаў калію. Яго мінеральныя ўгнаенні пастаўляюцца ўжо больш чым у сотню дзяржаў.

Важна таксама адзначыць, што паспяховая работа гіганта дазваляе развівацца і іншым арганізацыям. Па яго заказах прадпрыемствы Салігорскага раёна вырабляюць горна-шахтавае і іншае абсталяванне, імпартазамяшчальную тэхніку. Усё часцей гэта робіцца з выкарыстаннем новых тэхналогій.

Прыкладна тое ж самае можна расказаць пра ролю ААТ «БелАЗ» і многіх

# Б'ЕЦЦА ЎПЭЎНЕНА

## чаго рэгіён дасягнуў за дваццаць пяць гадоў

іншых заводаў, фабрык, аграфірмаў.

**— Цэнтральны рэгіён заўжды адзначаўся стратэгічнымі інвестыцыйнымі праектамі, адзін з найбольш глабальных — парк «Вялікі камень» — найбуйнейшы хаб ва Усходняй Еўропе праекта «Адзін пояс, адзін шлях». Гэта стратэгічны аб'ект для ўсёй краіны, а як ён уплывае на развіццё рэгіёна, на тэрыторыі якога знаходзіцца?**

— Самым станоўчым чынам. Гэта наша галоўная інавацыйная пляцоўка. Тут рэалізуюцца праекты ў галіне тонкай хіміі, біятэхналогіі, электронікі, машынабудавання, новых матэрыялаў. Цяпер у парку зарэгістраваны 44 рэзідэнты з 8 краін. Ва ўсіх сур'ёзныя планы. Напрыклад, ужо сёлета пачне выпускаць сваю прадукцыю кітайская кампанія «Вайс Ізі Інтэрнэшнл Бел» — адзін з сусветных лідараў па выпуску плацежных тэрміналаў.

ТАА «Дуамедыка» рэалізуе праект, арыентаваны на развіццё новых тэхналогій, якіх пакуль няма ў Беларусі. У прыватнасці, будуць вырабляцца прылады для падтрымання функцыі сэрца і кровазвароту ў людзей з саслабленай сардэчнай мышцай.

Цікавыя перспектывы ў Кітайска-Беларускага цэнтра даследаванняў і распрацовак, які па праве лічыцца прадпрыемствам заўтрашняга дня. Ён заснаваны аэракасмічнай карпарацыяй КНР і займецца навукова-даследчай дзейнасцю ў сферы касмічных тэхналогій. Дарэчы, у галіне навуковых даследаванняў і тэхналагічных распрацовак у парку павінна дзейнічаць яшчэ з дзясятак арганізацый. Гэта, вядома, надасць дадатковы імпульс нашай інжынернай і навуковай думцы.

На сённяшні дзень сума прыцягнутых паркам інвестыцый складае каля паўмільярда долараў. Варта ўлічыць, што львіную долю работ на інфраструктурных аб'ектах выконваюць беларускія падрадчыкі. З улікам гэтага ў бюджэт у выглядзе падаткаў за час функцыянавання «Вялікага каменя» паступіла каля 40 мільёнаў долараў. У цэлым інвестыцыі толькі дзеючых рэзідэнтаў па завяршэнні іх праектаў складуць каля мільярда долараў. Будзе створана 3500 высокапрадукцыйных рабочых месцаў. А да 2025 года, калі ў парку будзе зарэгістравана пад 300 рэзідэнтаў, колькасць такіх рабочых месцаў наблізіцца да 20 тысяч. Міншчына, як і ўся краіна, атрымае мноства інавацыйных, экспартаарыентаваных вытворчасцяў. Гэта вялікая карысць для нашай эканомікі.

Як і тое, што на тэрыторыі парка вырасце «разумны» горад. Уся вытворчая, жылая і адміністрацыйная інфраструктура ў ім будзе гарманічна спалучацца з сацыяльнай. Прычым адным з галоўных прыярытэтаў тут стане экалогія. На першым этапе плануецца засяленне тэрыторыі пяццю тысячамі жыхароў. Для іх узвядуць шматкватэрныя пяціпавярховікі і індывідуальныя дамы, крамы, стадыён, паліклініку, агульнаадукацыйную школу, дзіцячы сад — яслі, электрычную падстанцыю, цэнтр забеспячэння правапарадку.

У парку таксама з'явіцца найбуйнейшы ў Беларусі лагістычны цэнтр. Гэта будзе вузлавая пляцоўка стратэгічнага кітайскага праекта «Пояс і Шлях» у Заходняй Еўразіі.

**— Гаворачы пра супрацоўніцтва Мінскай вобласці з кітайскімі партнёрамі, не абысці праблему выпуску легкавых аўтамабіляў «БелДжы». Наколькі паспяхова развіваецца прадпрыемства і якія яго перспектывы?**

— Нягледзячы на тое што на рынку легкавых аўто сёння існуе жорсткая канкурэнцыя, мы лічым, што ў праекта вялікая будучыня. Прадпрыемства, якое размясцілася паміж Барысавам і Жодзінам, пачало работу ў канцы 2017 года. Але ўжо на сённяшні дзень беларускі бок змог дамагчыся 50-працэнтнай лакалізацыі вытворчасці. Гэта значыць, напалову яна засяроджана ў нас, што істотна пашырыла магчымасці нашага машынабудаўнічага комплексу. На Міншчыне з'явіліся новыя заводы па выпуску сілавых агрэгатаў, радыятараў, сядзенняў, рухавікоў. А гэта ўсё дадатковыя даходы і новыя рабочыя месцы. Летась выпушчана каля дзевяці тысяч аўтамабіляў «Джылі», сёлета будзе больш за 20 тысяч, а ў далейшым плануецца павялічыць гэту колькасць у шэсць разоў. Асноўным рынкам збыту з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Але мы працуем над пашырэннем геаграфіі паставак. Сярод меркаваных імпарцёраў — іншыя краіны Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама Украіна, Літва, Польшча.

Не забываем, вядома, і пра ўнутраны рынак Беларусі. Распрацавана праграма продажу машын гэтай маркі фізічным і юрыдычным асобам з дапамогай гнуткай сістэмы крэдытавання і лізінгу.

**— Паспяховае эканамічнае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі сёння немагчыма без развіцця прыватнай ініцыятывы. Як на Міншчыне ідуць справы ў дадзеным кірунку?**

— Яму надаецца пільная ўвага. І не без поспеху. Бізнес усё мацней устае на ногі. Вялікі ўплыў на яго развіццё аказалі Дэкрэт Прэзідэнта № 10, які датычыцца паляпшэння ўмоў для інвестыцый, і Дэкрэт № 6, накіраваны на стымуляванне прадпрымальніцкай дзейнасці.

З моманту ўступлення ў сілу першага з названых дакументаў на тэрыторыі Мінскай вобласці паспяхова рэалізавана каля 200 інвестыцыйных праектаў. Гэта дапамагло дадаткова прыцягнуць звыш двух мільярдаў рублёў інвестыцый і стварыць больш за 15 тысяч новых працоўных месцаў у



прамысловасці, сельскай гаспадарцы, лагістыцы, турызме, гандлі.

Другі дэкрэт прымусіў бізнес рэальна павярнуцца тварам да рэгіёнаў, што спрыяла развіццю малых і сярэдніх гарадоў. Штогод падатковымі льготамі па Дэкрэце № 6 карыстаюцца каля 400 суб'ектаў прадпрымальніцтва вобласці. Агульная гадавая сума льгот складае 35-37 мільёнаў рублёў. Не выпадкова пасля прыняцця заканадаўчых змяненняў колькасць прадпрымальнікаў на Міншчыне павялічылася на 30 %. Самае галоўнае — было створана 25 тысяч новых кампаній, не кажучы ўжо аб значным росце колькасці індывідуальных прадпрымальнікаў.

Нас радуе, што гэты працэс у поўнай меры закрануў і сельскае насельніцтва. Толькі летась створана 40 фермерскіх гаспадарак. Цяпер у нашым рэгіёне іх 767. І, трэба сказаць, працуюць яны даволі паспяхова. На іх долю, напрыклад, даводзіцца амаль 40 % бульбы, якая вырошчваецца, больш за чвэрць садавіны і ягад, палова гародніны. Аб'ёмы вытворчасці штогод растуць. Гэтаму спрыяе тое, што сялянскім гаспадаркам нароўні з іншымі сельгасвытворцамі аказваецца ўсямерная дзяржаўная падтрымка. Гэта датычыцца крэдытаў, набыцця і рамонту тэхнікі, забеспячэння насеннем і сродкамі аховы раслін, ветэрынарнага абслугоўвання, меліярацыі зямель, навуковага кансультавання і шмат чаго іншага. Не будзем забываць, што, акрамя фермерскіх, у нас значную вагу маюць прыватныя падсобныя гаспадаркі, якія таксама карыстаюцца дапамогай дзяржавы. Напрыклад, у закупцы племянной жывёлы, угнаенняў, рэалізацыі лішкаў прадукцыі.

За 2018 год бюджэтныя паступленні ад прадпрымальніцкага сектара істотна ўзраслі і склалі больш за 1,3 мільярда рублёў. Яго доля ў кансалідаваным бюджэце вобласці наблізілася да 40 %. Гэта салідны вынік.

Яшчэ адзін цікавы факт: вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі ў Мінскай вобласці на 16 % забяспечваецца суб'ектамі малога і сярэдняга бізнесу. Летась яны вырабілі прадукцыі больш чым на 130 мільёнаў долараў. Можна з упэўненасцю сказаць, што прадпрымальніцтва — адзін з драйвераў нашага эканамічнага росту.

**— Цэнтральны рэгіён з'яўляецца першапраходцам у вырашэнні адной з самых актуальных праблем часу — стварэнні гарадоў-спадарожнікаў. Якія перспектывы ў рэалізацыі гэтай праграмы?**

— Гэта вельмі важны і вялікі праект. Не выпадкова кіраўнік дзяржавы зноў закрануў дадзеную тэму ў сваім нядаўнім пасланні народу і парламенту. Як вядома, раней было вызначана шэсць гарадоў-спадарожнікаў — Дзяржынск, Заслаўе, Лагойск, Смалявічы, Фаніпаль і гарадскі пасёлак Рудзенск. Ёсць адпаведная пастанова Саўміна аб іх развіцці. Прэзідэнт паставіў задачу паскорыць работу ў гэтым кірунку. Цяпер ідзе карэкціроўка генеральнага плана забудовы названых гарадоў. Самае галоўнае — усе напрацоўкі маюцца, ёсць фінансаванне. Словам, працэс пайшоў, і, думаю, ужо ў недалёкай будучыні мы ўбачым першыя адчувальныя вынікі.

**— З увядзеннем бязвізавага рэжыму для тых, хто прыязджае да нас праз Нацыянальны аэрапорт «Мінск», колькасць турыстаў не толькі ў сталіцы, але і ў прысталічным рэгіёне значна павялічылася. Прыцягваюць Нясвіж, Нарач, іншыя аб'екты і мясціны, якім менавіта ў незалежнай Беларусі быў нададзены належны статус. Але, несумненна, галоўнае ў развіцці турыстычнага патэнцыялу — чалавечая ініцыятыва. Што ў вобласці робіцца, каб яе заахвоціць?**

— Развіццё турызму шмат у чым залежыць ад дзелавога клімату. Таму часткова я ўжо адказаў на гэтае пытанне, калі казаў пра паляпшэнне ўмоў для прадпрымальніцкага сектара. Яго стымуляванне працягваецца, і спыняцца на гэтым шляху мы не збіраемся. Кожная слушная прапанова, якая датычыцца прыцягнення турыстаў у наш край, будзе пачута і ўзята на ўзбраенне. Мы павінны ў поўнай меры выкарыстаць магчымасці сваёй інфраструктуры. У нас мноства гасцініц, кафэ, санаторыяў, аграсядзіб, паляўнічых угоддзяў, гісторыка-культурных помнікаў і маляўнічых прыродных зон. Гарады і пасёлкі чыстыя і дагледжаныя. У добрым стане дарогі, уздоўж якіх усё больш заправачных станцый, пунктаў гандлю, аўтарамонту, кемпінгаў, месцаў зручнага начлегу, іншых паслуг. Але ўсё гэта па вялікім рахунку толькі пачатак. Нам яшчэ ствараць і ствараць, у тым ліку прафесійна займацца рэкламаваннем нашых славутасцяў, месцаў аздараўлення і адпачынку. Толькі тады на нас звернуць належную ўвагу замежныя аматары падарожжаў, палявання, старадаўніх звычаяў і абрадаў, карыснай і смачнай ежы, некранутых цывілізацыяй куткоў прыроды. Летась, дарэчы, Міншчыну наведалі госці з 38 краін — каля дзесятка тысяч чалавек. Гэта вельмі мала. Трэба, каб сюды прыязджалі сотні тысяч.

Ну і вядома, неабходна больш актыўна займацца ўнутраным турызмам. Усе нашы багацці патрэбныя перш за ўсё нам самім. Радуе, што набірае абароты, напрыклад, такі від турызму, як наведванне вядомых прадпрыемстваў. У апошні час людзі аб'ядноўваюцца ў групы, каб на свае вочы ўбачыць, як здабываецца калійная соль, збіраюцца велізарныя БелАЗы, як ткуць слуцкія паясы і ствараюць ювелірныя вырабы. У турыстычнай галіне ў нас невычэрпныя магчымасці. Асабліва калі падыходзіць да справы з фантазіяй. Як, напрыклад, гаспадары адной сядзібы пад Мінскам. Яны даюць магчымасць наведвальнікам самім зварыць мыла, вырабіць муку дзедаўскім спосабам або павучыцца даіць карову, для чаго выстаўлены яе макет у натуральную велічыню.

**— Дарэчы, Анатоль Міхайлавіч, вы ж самі родам з вёскі. З простага вясковага хлопчыка, які дапамагаў маці даіць карову, выраслі ў кіраўніка цэнтральнага рэгіёна краіны. Што асабіста для вас азначае апошняя чвэрць стагоддзя?**

— Мой асабісты лёс — яркае пацвярджэнне таго, што ў нас створана сапраўды народная дзяржава, у якой эфектыўна працуюць сацыяльныя ліфты. Чалавеку адкрыты ўсе магчымасці. Для мяне гэтыя 25 гадоў былі самымі змястоўнымі і значнымі. Бо з імі амаль цалкам супаў мой працоўны шлях, пачынаючы ад інжынера на сельгасвытворчасці і заканчваючы цяперашняй пасадай. Былі і поспехі, і засмучэнні. Але заўсёды грэла думка пра тое, што твае старанні абавязкова пойдуць на карысць Радзіме. На працягу чвэрці стагоддзя на нашых вачах умацоўваецца беларуская дзяржаўнасць, акультурваюцца гарады і вёскі, людзі праяўляюць свае таленты, здзіўляюць яркімі дасягненнямі ў розных сферах жыцця. І я радуюся таму, што ва ўсім гэтым ёсць і частка маёй працы.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



Базарны дзень

# КОЛЕРАВЫ... КОД

**На «Славянскім базары ў Віцебску» адкрылася цікавая выстаўка «Белае, чырвонае, чорнае: сімволіка колеру ў народнай культуры». Экспанаты — з фондаў музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Іх можна ўбачыць у самым вядомым віцебскім будынку — у гарадской ратушы.**

На віцебскім міжнародным фестывалі мастацтваў штогод па традыцыі прэзентуюць вельмі шмат выставак. І сёлетні фестываль не стаў выключэннем. Таму вельмі цяжка здзівіць гледачоў, як бы шчыра гэтага ні хацелася. Але гомельскім музейшчыкам удалося зрабіць цуд. Сведчанне таму — на прэзентацыі выстаўкі было шмат публікі. І гэта ў дзень, калі ў горадзе паралельна існавала мноства іншых цікавых лакацый для наведвання.

Выстаўка «Белае, чырвонае, чорнае: сімволіка колеру ў народнай культуры» расказвае пра вытокі ўтварэння бел-чырвона-чорнай «трыяды» і яе выкарыстанне ў сусветнай культуры. Яна дае ўяўленне пра сімволіку вытканых і вышытых узораў, якія ўпрыгожвалі адзенне і прадметы побыту нашых продкаў, а таксама пра трансфармацыю ўяўленняў аб прыгажосці і актыўнае ўкараненне палітры фарбаў у народную традыцыю.

На выстаўцы прадстаўлены прадметы хатняга ўбрання (ручнікі, посцілкі), дэталі жаночага і мужчынскага традыцыйнага адзення (кашулі, галаўныя ўборы, паясы і іншае). Разглядваючы іх, можна прасачыць эвалюцыю арнаментаў: ад архаічных, напоўненых сакральным сэнсам, да дэкору, прыўнесенага цывілізацыяй.

У розных рэгіёнах Гомельскай вобласці гэтыя працэсы ішлі па-рознаму, што паўплывала на ўзнікненне рэгіянальных асаблівасцяў у адзенні і фарміраванне народных строяў...

Паводле слоў **намесніка дырэктара па навуковай рабоце Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Валерыя ШЫШАНАВА,** сёлета Гомельскі палацава-паркавы ансамбль святкуе сваё стагоддзе. І канешне, вельмі лагічна, каб унікальныя калекцыі ўбачылі не толькі ў абласным цэнтры. Таму віцебскія калегі вельмі рады супрацоўніцтву.

І адкрыццё выстаўкі — гэта знакавая падзея не толькі для віцебскага музея, але і для ўсяго «Славянскага базару», тым больш што ў гэтыя дні на фестывалі часта можна ўбачыць людзей у нацыянальных касцюмах. Сучаснае адзенне з арнаментам усё больш у трэндзе. І вельмі цікава параўноўваць, зразумець, адкуль карані, чаму менавіта так, а не інакш выглядае нешта на адзенні.



На цырымоніі адкрыцця выстаўкі **галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Дзяніс ЮРЧАК** ад імя ўсіх прысутных выказаў вялікую ўдзячнасць арганізатарам. Дзякуючы ім можна паспрабаваць зразумець, як успрымалі свет нашы продкі. У колеры і арнаменце яны адлюстроўвалі сакральны сэнс. У народнай культуры існуюць векавыя традыцыі выкарыстання колеру, сказаў ганаровы госць.

На выстаўцы прадстаўлены традыцыйныя касцюмы з розных раёнаў поўдня Беларусі. І кожны мае свой каларыт, гармонію, свае адметныя асаблівасці.

Калекцыя этнаграфіі музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля пачала фарміравацца ў 1920-я гады. Цяпер яна налічвае больш за тры тысячы адзінак! Прадметы ткацтва, народных касцюмы датуюцца XIX — сярэдзінай XX стагоддзя і з'яўляюцца найбольш каштоўнай часткай гэтай калекцыі.

Выстаўку штодня наведваюць сотні чалавек, прадстаўнікі розных краін. І кожны пакідае яе з думкамі пра сувязь мінулага і сённяшняга, якія нябачнай ніццю яднаюць колеры, элементы арнаменту.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**


**21 августа 2019 г.** **№4-Н/2019**

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукционных торгов по продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права заключения договора аренды земельного участка в г. Гомеле**

| № лота | Наименование объекта/адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение | Кадастровые номер и площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. | Наличие ограничений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 109 по генплану, (ул. Полякова, 1) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 340100000008002510 0,0840 га | **12 711,05** | **200,00** | **3 051,19** | Земельный участок не имеет ограничений в использовании, на участке присутствует фундамент, обременения в виде следов проведения земляных работ |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

1.1 **Начальная цена** предмета аукциона сформирована как сумма начальной цены не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере 6 874,09 бел. рубля и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере 5 779,20 бел. рубля, а также расходов на оценку не завершенного строительством жилого дома в размере 57,76 рубля.

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, предоставляемом в аренду сроком на 99 лет, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.** Получить в установленном порядке разрешительную документацию на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство одноквартирного жилого дома. Желающим предварительно ознакомиться с документами обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. №№ 3–6, №№ 3–14).

3. **Аукцион состоится 21 августа 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане,индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и юридические лица, а также иностранные юридические лица, иностранные граждане. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц.** Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

**Перечень документов, предоставляемых участником:**

4.1 заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам РБ –** копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина –** нотариально удостоверенная доверенность.

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхожденияв (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности в процессе подготовки и проведения аукциона.

**6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок) за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

6.1 На основании постановления Совета Министров Республики Беларусь № 298 от 01.04.2014 г. – возместить затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку (не распространяется на граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий). Величина затрат определяется администрацией района г. Гомеля, по месту нахождения земельного участка, при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома.

6.2 После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка. 6.3 Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

**7. Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 16 июля по 19 августа 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14. Контактный телефон 30-12-46. Информация размещена на сайте: www.gomeloblzem.by либо geodezcentr.by**



**К публикации Коммунального топографо-геодезического унитарного предприятия «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» о проведении аукциона на право заключения договов аренды земельных участков в г. Гомеле № 10-А/2019, который состоится 7 августа 2019 г. (объявление опубликовано в газете «Звязда» 02.07.2019 г.) добавляется лот № 4 в следующей редакции:**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, лет | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 | В микрорайоне Энергетиков, 16 | 340100000005007402 | 0,0020 | Для размещения легкотипного торгового павильона | Органичений в использовании не имеет | 5 | 89,35 | 10,00 | 2 534,24 |

***Лот № 4 выставляется на аукцион повторно, извещение опубликовано 04.06.2019 г. в газете «Звязда»***

УНП 400230163

**Контактный телефон +375 232 30-12-46. Информация размещена на сайте: www.qomeloblzem.by либо geodezcentr.by**



РРБ современный европейский банк

**Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития»**

220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18

**www.rrb.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

**на 1 июля 2019 г.**

***(в тысячах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2019 | 01.01.2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 10 286 | 9 131 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 27 542 | 27 718 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 8 021 | 16 207 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 21 552 | 21 537 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 142 864 | 135 413 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 32 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 19 669 | 20 040 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 510 | 510 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 25 | 28 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 7 693 | 9 257 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 238 162 | 239 873 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 714 | 2 829 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 170 369 | 174 234 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 20 469 | 15 223 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 228 | 2 219 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 192 780 | 194 505 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 20 429 | 20 429 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 6 017 | 5 615 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 6 207 | 6 218 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 12 729 | 13 106 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 45 382 | 45 368 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 238 162 | 239 873 |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках

**на 1 июля 2019 г.**

***(в тысячах белорусских рублей)***

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2019 | 01.07.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 7 511 | 7 147 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 4 621 | 3 808 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 890 | 3 339 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 3 422 | 1 483 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 517 | 410 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 905 | 1 073 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (26) | 2 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 741 | 727 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (43) | (2) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 885 | (284) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3 359 | 5 512 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 8 320 | 10 064 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 118 | 160 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 503 | 711 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 263 | 231 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 1 240 | 480 |

Председатель Правления В. В. Дранкевич

Главный бухгалтер Н. Н. Мостыко

Дата подписания 15 июля 2019 г. УНП 100361187

Круглы стол

# У ПОШУКУ НОВЫХ ФОРМАЎ І ЗМЕСТУ



## На «Славянскім базары» абмеркавалі патэнцыял развіцця фестывалю і стан беларускай культуры на сучасным этапе

**Пасяджэнні круглага стала на тэму «Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцяў. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў» адбываюцца на мастацкім форуме з 2015 года. Арганізатарамі гэтай сустрэчы традыцыйна выступаюць Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры і Выдавецкі дом «Звязда». Тэма дыскусіі застаецца нязменнай, але аргументы і высновы, да якіх прыходзяць удзельнікі — прадстаўнікі вядучых СМІ, кіраўнікі фестывальнага руху, дзеячы культуры і мастацтва з розных краін, — штораз набываюць новае гучанне, актуальнае ў бягучы момант.**

**Генеральны дырэктар Нацыянальнага музея Султаната Аман Джамаль МУСАВІ** прыехаў у Віцебск упершыню, каб пазнаёміцца з багатай культурнай праграмай фестывалю і разгледзець магчымасць удзелу сваёй краіны ў мерапрыемствах «Славянскага базару» налета. Штуршком да развіцця культурных стасункаў паміж нашымі краінамі стаў візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Султанат Аман у 2007 годзе, пазней прайшоў першы сумесны праект.

«У верасні сёлета плануем адкрыць у Мінску выстаўку, прымеркаваную да 80-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Акрамя таго, у 2020-м хацелі б прыняць у Маскаце Дні культуры Беларусі», — расказаў Джамаль Мусаві.

**«Фестываль — адзіны арганізм. Таму і артыстам, і прэсе, і ўсім суправаджаючым службам трэба працаваць у камандзе, не ўключаючы «зорку», але адкрываючы для публікі новыя цікавыя імёны».**

Мадэратар дыскусіі — **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ** зазначыў, што культура і мастацтва адыгрываюць




выключную ролю ў фарміраванні мірнай гуманітарнай прасторы ва ўсім свеце: «Славянскі базар» ужо даўно ператварыўся з забаўляльнага мерапрыемства ў глабальны мультыкультурны форум. І цяпер яго мэты і задачы, якія стаяць у тым ліку перад намі, прадстаўнікамі медыя, дзеячамі мастацтва, — не толькі паказаць Беларусь з найлепшага боку, але і абмеркаваць праблемы, якія фарміруе час».

«Я ўсёй душою хварэю за «Славянскі базар» і хачу, каб ён развіваўся, пашыраў фармат, — падзяліўся **старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА.** — Напрыклад, асабіста мне заўжды не хапае джазу, хацелася б яго на фестывалі больш. Альбо яшчэ пытанне: чаму няма класічных формаў? Помніце, быў год, калі Украіна прадстаўляла класічны праект, і гэта было цудоўна прынята гледачамі. Чаму б не паўтарыць? Лічу, што форум не толькі захавае сябе, але і прыцягне новае пакаленне гледачоў толькі тады, калі пачне прымаць новыя формы, адэкватныя часу».

Падтрымалі гэта меркаванне і **першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ і старшыня Віцебскага абласнога аддзялення саюза Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА**, якія зазначылі: адзін з неабходных складнікаў поспеху — адкрыццё новых культурных пляцовак, у прыватнасці, большае скарыстанне творчых сіл пісьменнікаў і паэтаў з Беларусі і іншых краін.

Прадстаўнікі вядучых СМІ, якія штогод шчыльна працуюць на «Славянскім базары», падзяліліся сваім бачаннем ролі медыя ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы і ўмацаванні духоўна-маральных каштоўнасцяў. Так, **дырэктар прадстаўніцтва МТРК «МІР» у Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ** нагадаў: «Культура і мастацтва — не толькі крыніца, але і праваднік духоўна-маральных каштоўнасцяў. У спрэчцы аб тым, што важнейшае на фестывалі — камерцыйны або творчы складнік — давайце не забывацца пра гэта».

Такую ж думку — выхаванне добрага густу ў грамадстве, падтрымка высокага мастацтва — працягнуў **кіраўнік БДА «Песняры» Раман КОЗЫРАЎ**. А **генеральны дырэктар расійскага інфармацыйнага агенцтва Intermedia Яўген САФРОНАЎ** дадаў: «Фестываль штогод нясе шырокай аўдыторыі велізарную колькасць культурных з'яў, таму яго трэба ўсяляк падтрымліваць і захоўваць».

«На мой погляд, роля журналістаў у тым, каб не толькі максімальна шырока асвятляць падзеі і выдаваць кантэнт, але і адукоўваць чытача, і самім ствараць новыя інфармацыйныя нагоды, — падзялілася **генеральны дырэктар Беларускага тэлеграфнага агенцтва Ірына АКУЛОВІЧ**. У якасці прыкладу яна прыгадала, як журналісты БелТА ініцыявалі правядзенне конкурсу перакладаў «Дистихов» Максіма Багдановіча.

«Кажуць, што можна нарадзіцца Моцартам, але ніколі ім не стаць, — заўважыла **тэлевядучая Святлана БАРОЎСКАЯ**. — Калі б артысты спявалі і іх не здымала тэлебачанне, пра іх не пісалі б газеты, яны так і спявалі б дома маме, а не на сцэне «Славянскага базару». Эмацыянальна, але даходліва тэлевядучая выказала галоўную думку: фестываль — адзіны арганізм. Таму і артыстам, і прэсе, і ўсім суправаджаючым службам трэба працаваць у камандзе, не ўключаючы «зорку», але адкрываючы для публікі новыя цікавыя імёны.

**Мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя У. Мулявіна Святлана СТАЦЭНКА** зрабіла абсалютна канкрэтную прапанову: аддаць больш увагі дзіцячаму конкурсу. На яе думку, трэба праводзіць хоць адзін яго дзень на галоўнай пляцоўцы фэсту і ў суправаджэнні аркестру, вярнуць прамы эфір і прыз глядацкіх сімпатый, — усё гэта павысіць узровень маленькіх артыстаў і прыцягне вялізную аўдыторыю — іх аднакласнікаў, сваякоў, педагогаў, іншых таленавітых дзяцей і іх бацькоў ды г. д.

**Уладальнік Гран-пры «Славянскага базару — 2004»**, **спявак і кампазітар Пётр ЯЛФІМАЎ** рэзюмаваў: «Было б цудоўна, каб усё сказанае было пачута, і праграма фестывалю стала разнастайнай і цікавейшай. Каб не было так: блок папулярнай музыкі, народны, дзіцячы — бах, фінал, салют! Хацелася б бачыць на вялікай сцэне не толькі папулярную музыку, але і класічную, і рок, і джаз, і тэатральнае мастацтва, і харэаграфію, каб як мага больш цудоўных калектываў маглі прадставіць сваё мастацтва на гэтым форуме, на сёння найбуйнейшым у свеце».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і БелТА.**

Зорны госць

Таісія ПАВАЛІЙ:

# «55 — САМЫ СМАК!»

**Пераможца конкурсу маладых выканаўцаў на «Славянскім базары ў Віцебску», народная артыстка Украіны і Інгушэціі, уладальніца ордэнаў Святой Ганны і Святога Мікалая Цудатворца, спявачка, у гонар якой сёлета запалілася новая імянная зорка ў Віцебску, — Таісія ПАВАЛІЙ расказала пра ўзрост, калекцыю капялюшыкаў і дуэт з Прэзідэнтам.**

— У 1993-м пасля конкурсу я моцна прастудзілася, у мяне не паварочвалася шыя, было вельмі дрэнна, памятаю, што мне калолі анальгін, каб хоць неяк рухалася. І тут Ігар, мой будучы муж, які ўваходзіў у склад украінскай дэлегацыі, грукае ў дзверы: «Тая, уставай, цябе тэрмінова чакаюць у прэс-цэнтры!» У прэзідыуме сядзела Надзея Бабкіна, якая і абвясціла: «Гран-пры — Таісія Павалій!» Захавалася нават відэа, дзе я, забыўшыся на боль, скачу ад радасці. Гэты шчаслівы дзень, першы Гран-пры ў гісторыі конкурсу, мы з украінскай дэлегацыяй адзначалі спачатку ў гасцініцы «Дзвіна», а потым — у зваротным цягніку «Віцебск—Кіеў». Але я ўсё яшчэ не верыла, што гэта адбываецца са мной, у маім жыцці. І толькі калі на пероне ў Кіеве нас сустракалі, здаецца, усе тэлекамеры, уся прэса Украіны, прыйшло разуменне: я — пераможца! Літаральна ў адзін дзень я стала зоркай. Напэўна, гэта тое, аб чым мараць усе артысты: каб вокладкі ўсіх часопісаў выходзілі з тваім фота, а на радыёстанцыях гучала твая песня... Гэта быў узлёт, за які дагэтуль удзячная «Славянскаму базару».



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Праз 26 гадоў пасля перамогі Таісія Павалій не толькі помніць кожную нотку сваёй конкурснай песні, але і захоўвае адмысловы капялюшык, у якім скарыла журы і публіку ў Віцебску. У яе наогул сабралася цэлая калекцыя галаўных убораў — самых дарагіх сэрцу каля 20, астатнія артыстка без шкадавання раздорвае. Але гэтак жа часта і набывае новыя капелюшы: «Дзе мяне можна заўжды знайсці, гэта ў аддзеле галаўных убораў».

А яшчэ спявачка беражліва захоўвае дома мноства ручнікоў, найстарэйшы з якіх датуецца 1913-м — і вышыты яе бабуляю. «У прыгожай вышыўцы на гэтым ручніку — дрэвы, кветкі... карані, птушкі, арнамент — дакладна схаваны нейкі код, і я спрабую разгадаць, які знак падае мой род».

Дарэчы, творчыя гены перадаліся ў спадчыну яе сыну Дзянісу Павалію: ён музыкант-мультыінструменталіст і кампазітар, які піша свой першы альбом.

Цяпер Таісія Павалій не так шмат выступае, бо рыхтуе вялікую сольную праграму, якой хоча адзначыць у Кіеве прыгожы юбілей — у снежні спявачцы будзе 55 гадоў. «60 — гэта ўжо неяк многа, а 55 — самы смак! — смяецца артыстка. — Так што праграма будзе драйвовая, з самымі лепшымі хітамі. Я наогул вельмі люблю спяваць на сцэне, бо ў студыі ўсё здаецца неяк бляклае, хочацца перарабіць, а на сцэне тая энергетыка, якая зараджае як след. І не трэба ніякага шоу, хочацца, каб нішто не перашкаджала стасункам са слухачамі. Ведаеце, часта хочацца падысці да кожнага ў зале, узяць за руку і праспяваць толькі для яго, каб перадаць пачуцці».

Многія памятаюць, як Таісія Павалій падчас Купалля ў Александрыі нечакана праспявала разам з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. «З якімі яшчэ вядомымі палітыкамі вы хацелі б выступіць дуэтам?» — пацікавіліся журналісты. «Амбіцыйная частка мяне ўжо задаволеная, бо дуэт з Аляксандрам Лукашэнкам атрымаўся цудоўны, — мяркуе спявачка. — Ён настолькі абаяльны і чысты чалавек, што спяваць разам было адно задавальненне. Але можам паўтарыць, тым больш тая песня «Вярба» ўкраінскага паэта напісана на музыку беларускага кампазітара, а яе першым выканаўцам быў расійскі калектыў «Самацветы», так што гэта прадукт дружбы народаў. І калі што, я зноў падыду да Аляксандра Рыгоравіча, і мы спяём яе разам!»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# Гульні ў хованкі, «ажыўшыя» карціны, дамашнія канцэрты...

## МАСТАЦТВА БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

Магілёўскі музей В. Бялыніцкага-Бірулі нядаўна рэалізаваў цікавы праект «Гукі жыцця», у якім удзел бралі менавіта людзі з абмежаванымі магчымасцямі.

— Гэта была інклюзіўная праграма на базе выстаўкі з Траццякоўскай галерэі і фондаў Нацыянальнага мастацкага музея, — кажа **загадчыца музея Святлана СТРОГІНА.** — Мы запрасілі людзей розных па ўзросце, самаму малодшаму з іх было 17 гадоў. Шукалі іх праз таварыства інвалідаў, тэлефанавалі ўсім персанальна і запрашалі паўдзельнічаць у праекце. У выніку шмат хто адгукнуўся, з імі прыехалі іх бацькі — прадстаўнікі былі з Магілёва, Гомеля, Мінска і нават бялыніцкай вёскі Вішоў Магілёўскай вобласці. Да праекта далучылася прафесійная каманда, у якой быў вопыт работы з такімі праграмамі. Прыехалі супрацоўнікі Нацыянальнага мастацкага музея, прадстаўнікі Шведскага інстытута, саўнд-артысты. Усе тры дні нашай работы былі напоўнены асаблівай атмасферай, усё рабілася ў гульнявой форме, былі кава-паўзы, мы разам хадзілі на абед — усім было вельмі камфортна, кожны адчуваў сябе сваім у камандзе. І разнявольваўся. Чым усё закончыцца, не ведаў ніхто. Усё залежала ад таго, як спрацуе каманда, як атрымаецца апісаць карціну гукамі, рухамі. Мы падзяліліся на невялічкія групы і працавалі то з адным, то з другім чалавекам, потым інфармацыя апрацоўвалася, і ў нас з'явіўся такі фільм «Гукі жыцця», або «Ажыўшыя карціны», які даў магчымасць нетрадыцыйным спосабам прачытаць мастацкія творы. Гэта было нешта зусім не падобнае на тое, як магло бачыцца пры стандартнай экскурсіі. Мы далі магчымасць кожнаму расказаць пра карціну так, як ён яе бачыць. У выніку да кожнай стварылася свая «агучка». «Залілі» ўсё гэта ў аўдыя-, відэагіды і запрасілі экспертаў. На мой погляд, атрымалася вельмі цікава. Калі карцінка перад вачыма, і ты слухаеш гукі да яе — успрыманне зусім іншае. Напрыклад, «Зімовы сон» Бялыніцкага-Бірулі — там спрэс зіма, удалечыні стаіць каплічка. Бялыніцкі-Біруля любіў пісаць цішыню, і я не ўяўляла, што ў карціну можна ўвесці брэх сабак або рыпенне снегу. Пачынаеш бачыць тое, чаго раней не бачыў. Тую ж вёсачку непадалёк.

Але самае вялікае дасягненне ў тым, што праграма дапамагла адаптавацца асаблівым людзям, зразумець, што яны не адзінокія. І гэта не адзіны праект з іх удзелам. Да Каляд у музеі была прымеркавана выстаўка інваліда-калясачніка Галіны Шыкуновай «Каляндная паштоўка». У гэтым снежні плануецца падобная выстаўка інваліда па слыху Зоі Ракузавай. У жанчыны, дарэчы, вельмі цікавы лёс. Маці дапамагла сваёй асаблівай дачцэ скончыць віцебскую ВНУ і адбыцца як мастачцы. Цяпер Зоя замужам, у яе дзве свае дачкі. Яны, як і іх бацькі, таксама глуханямыя. Але маці з імі актыўна займаецца, і яны таксама дэманструюць поспехі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Любоў да музея пачынаецца з сям'і.



Саўнд-акцёр са Швецыі Ян КАРЛЕ КЛЕФ запісвае гукі, якія ствараюць удзельнікі.

## ПА-СЯМЕЙНАМУ

На працягу года музей В. Бялыніцкага-Бірулі арганізуе дамашнія канцэрты. Для гэтага тут на другім паверсе ёсць камерная зала з раялем. Ствараецца атмасфера тых гадоў, калі было модна запрашаць у дамашнія музычныя салоны. І музей адраджае гэтыя традыцыі. На канцэрты прыходзяць цэлымі сем'ямі.

— Мы запрашаем вельмі якасных выканаўцаў і музыкантаў, — удакладняе Святлана Строгіна. — Знаёмім з новымі музычнымі інструментамі і праграмамі. У нас былі канцэрты фартэпіяннай музыкі, скрыпкі і фартэпіяна, нават пяціактаўнай марымбы. Выступала наша оперная спявачка мецца-сапрана Наталля Акініна. Быў канцэрт нашага земляка Аляксандра Музыкантава — вядомага выканаўцы фартэпіяннай музыкі. Шмат прыйшло моладзі, прыхільнікі яго творчасці прыехалі нават з Мінска.

У музыкі з карцінамі самая прамая сувязь, лічыць Святлана Строгіна. Вітольд Каятанавіч Бялыніцкі-Біруля вырас у сям'і, дзе стала гучала музыка. Ён нават бачыў яе ў фарбах. «А сыграй мне, матуля, жоўценькі», — прасіў ён сваю маці, маючы на ўвазе ліпень. Не дзіўна, чаму яго карціны такія тонкія, лірычныя. Самым першым прадметам на яго лецішчы «Чайка» ў Цвярской губерні быў менавіта нямецкі рояль. Той самы, на якім калісьці іграла Соф'я Кувшыннікава Ісаку Левітану, а ён пісаў свой «Вечны спакой». Тут усё ўзаемазвязана.

З 1 чэрвеня музей адкрыў сезон летніх канцэртаў у сваім дворыку. Аркестр «ВКА» з Мінска парадаваў дзяцей і іх бацькоў цудоўным творам «Пеця і воўк» Сяргея Пракоф'ева. Гледачоў было столькі, што нават не хапіла загадзя падрыхтаваных крэслаў, і людзі сядзелі проста на газонах, на пледах і дыванках. Усім было вельмі камфортна і ўтульна. Была магчымасць заказаць кубачак кавы. З водарам гэтага напою яшчэ лепш успрымаецца мастацтва. Яшчэ адзін канцэрт прысвяцілі Чарлі Чапліну, атрымалася нешта накшталт «кінемо» — гэткі open air на свежым паветры. Спецыяльна да яго была падрыхтаваная выстаўка мастакоў Валерыя Плаксіна і Уладзіміра Пахаўцова, якія ў сваёй творчасці звярталіся да гэтага персанажа.

## ГУЛЬНЯ Ў «ХОВАНКІ»

Гэты інтэрактыўны праект быў прэзентаваны падчас «Ночы музеяў» і меў вялікі поспех. У ім удзельнічалі як знакамітыя мастакі, так і пачаткоўцы. Перад наведвальнікам стаяла задача раскрыць у творы тое, што аўтар схаваў. Малады мастак Яўген Зайцаў прадэманстраваў эксперымент з зялёным колерам, як той хаваецца на працягу года — зараджаецца вясной, буяе летам, змяняе фарбу восенню і амаль знікае зімой. Або трэба было адгадаць, хто там схаваўся ў натоўпе. Усе людзі або жывёлы, напрыклад, з расплюшчанымі вачыма, а нехта адзін з заплюшчанымі — паспрабуй яшчэ знайдзі яго.

Мастацтва пашырае кругагляд, робіць чалавека больш адукаваным і цікаўным. Вядомы мастак Васіль Паленаў, дарэчы, настаўнік Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, стварыў у 1920-м годзе цікавую 3D-дыяраму для сялянскіх дзяцей, дзе паказаў кругасветнае падарожжа і ўсё гэта апісаў. Бо ведаў, што большасць з хлопчыкаў і дзяўчынак маладой савецкай краіны наўрад ці ведае пра тую ж Паўднёвую Амерыку ці Кітай. Гэтая дыярама знаходзіцца ў музеі Васіля Паленава ў Тульскай вобласці, з ім у музея В. Бялыніцкага-Бірулі вельмі вялікае сяброўства. І гэта паспрыяла таму, каб выстаўка на некаторы час пераехала ў Магілёў. На яе таксама хадзілі сем'ямі. І дзеці казалі, што гэта нават займальней, чым сядзець у інтэрнэце.

— А цяпер мы рыхтуемся да наступнага інтэрактыўнага праекта — прывозім калекцыю жывапісу Лідзіі Русланавай, якая захоўваецца ў фондах Нацыянальнага музея, — дзеліцца планамі Святлана Строгіна. — Будзе створана цікавая інтэрактыўная зона з патэфонам і пласцінкамі з запісамі песень Лідзіі Русланавай, яе фотаздымкамі, кнігамі, альбомамі. Будзе стаяць стол з карункавым абрусам, на ім — настольная лямпа, шалік, у якім выступала артыстка. Усё гэта асабістыя рэчы Лідзіі Андрэеўны, якія ў свой час паклапацілася набыць колішні дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея БССР Алена Аладава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота Святланы СТРОГІНАЙ.**

### ❍ У тэму

Шмат цікавых разнастайных праектаў рэалізуюць і іншыя музеі Магілёўшчыны. Гэта вясельныя абрады, майстар-класы, навуковыя лекцыі. І вельмі часта музейныя праграмы ствараюцца з разлікам на «асаблівых людзей». Абласны краязнаўчы музей імя Е. Раманава дапамагае дзецям з асаблівасцямі псіхічнага развіцця хутчэй адаптавацца ў грамадстве.

— Па сумесным плане мы працуем са спецыялізаванай школай, дзе вучацца такія дзеці, — удакладняе **старшы навуковы супрацоўнік музея Вольга БОНДАРАВА.** — Праект называецца «Музей і дзеці». Запусцілі мы яго тры гады таму. Да нас прыходзяць школьнікі малодшых класаў, і мы праводзім з імі заняткі на базе нашых экспазіцый. Улічваючы, што гэта менш уседлівыя і ўважлівыя дзеці, нашы заняткі праходзяць з інтэрактыўнымі гульнямі, віктарынамі. Тэмы вельмі розныя. Апошняе, што мы рабілі, гэта малюнкі да Дня абароны дзяцей. У нас у музеі праводзілася выстаўка гэтых работ. Карысць ад такіх заняткаў вельмі вялікая. Дзяцей цяпер не пазнаць. Да нас яны прыходзяць замкнутымі, шмат хто саромецца ўзяць у рукі аловак. Пастулова гэта праходзіць, развіваюцца іх творчыя схільнасці, з'яўляецца цікавасць. Гэта ім дапамагае хутчэй сацыялізавацца ў грамадстве, знайсці агульную мову з аднагодкамі. Мастацтва не толькі адукоўвае, але і яднае, наш праект прамое таму сведчанне.

---

### Між іншым

# ХТО, КАЛІ НЕ МЫ?

**У канцы чэрвеня адбылася прэм'ера беларускага сацыяльнага рэаліці-серыяла «Хто, калі не мы». Кожная серыя падымае пэўныя праблемы людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў нашай краіне і расказвае, як іх вырашаць. Першая была прысвечана інвалідам-калясачнікам, другая — невідушчым людзям. Прэзентацыя другой серыі прайшла на мінулым тыдні.**

— Серыял расказвае пра тое, як можна спрасціць жыццё людзей з інваліднасцю ў Беларусі, — распачаў **ініцыятар праекта Аляксандр АЎДЗЕВІЧ.** — Напрыклад, з яго вы даведаецеся, як, згодна з законам, пабудаваць пандус у сябе ў пад'ездзе ці ў якім-небудзь грамадскім месцы.

Адметнасць серыяла яшчэ і ў тым, што ўсе складаныя пытанні падымаюцца ў розных камічных сітуацыях. Таму яго можна з гонарам называць першым беларускім сіткамам.

— Спачатку мы проста хацелі расказаць аб тым, як людзі з абмежаванымі магчымасцямі вырашаюць рознага кшталту праблемы. Але ўсё гэта падалося нам вельмі сумным, і мы вырашылі надаць серыялу камедыйнасці, каб прыцягнуць агульную публіку, а пасля ўжо расказваць пра важныя рэчы. У нас ёсць сцэнарыст, які і выдумляе смешныя гісторыі для герояў, — расказвае Аляксандр.

Галоўнымі героямі серыяла з'яўляюцца сябры, якія пераехалі жыць у Мінск і сутыкаюцца з рознымі перашкодамі. У першай серыі сюжэт выбудоўваўся вакол гераіні, якую сыграла Аляксандра Чычкова, пераможца «Міс свету на інвалідней калясцы — 2017», у другой — вакол хлопца з сіндромам Даўна. Аўтары выводзяць людзей з інваліднасцю ў статус герояў, а магчыма нават і зорак.

— Наша задача ў тым, каб людзі не толькі пасмяяліся падчас прагляду серыяла, але і задумаліся аб тым, што яны могуць з гэтай праблемай зрабіць і куды пайсці. Каб яна вырашылася не праз год, а зараз і тут, — дзеліцца ініцыятар праекта. Дарэчы, другую серыю ўжо зараз можна паглядзець на ютуб-канале invaLIFE.

Хочацца верыць, што серыял сапраўды дасягне вялікай папулярнасці, а пасля яго прагляду грамадства задумаецца аб тым, як дапамагчы людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Бо хто, калі не мы?

**Маргарыта ГАЙДАРЖЫ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

З натуры

# ДА ДНА?

## Ужываем менш, але ўсё роўна рызыкуем

**90 бутэлек гарэлкі па 0,5 л — столькі выпівае за год сярэднестатыстычны беларускі мужчына. У тыдзень гэта больш за 1,5 бутэлькі гарэлкі пры ўмове, што чалавек не піў іншага алкаголю. Сярод наступстваў такой рызыкоўнай мадэлі ўжывання спіртных напояў — 20 тысяч смярцей беларусаў у год, ці 50 смярцей у дзень. Такія звесткі прывёў каардынатар праграм Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) па грамадскай ахове здароўя краінавага офіса СААЗ у Беларусі Валянцін РУСОВІЧ.**

Прадстаўнік СААЗ адзначыў першыя важныя поспехі нашай краіны па зніжэнні ўжывання алкаголю. Сапраўды, паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (бярэцца статыстыка за 2016 год), **узровень спажывання алкаголю ў Беларусі знізіўся з 17,5 да 11,2 л на кожнага дарослага чалавека, старэйшага за 15 гадоў.** Мы цяпер — на 27-м месцы ў свеце па спажыванні алкаголю на душу насельніцтва, хоць яшчэ некалькі гадоў таму былі адным з лідараў у сумным рэйтынгу.

Разам з тым СААЗ указвае, што ў нас ёсць вялікі патэнцыял у гэтым кірунку, рэалізуючы які мы маглі б у літаральным сэнсе выратаваць тысячы жыццяў, захаваць на ранейшым узроўні дзяржаўныя выдаткі і нават павялічыць паступленні ў дзяржбюджэт за кошт больш аптымальнай акцызнай палітыкі.

### Кожны трэці мужчына

11,2 л чыстага спірту ў год — гэта сярэдні паказчык. На самай справе беларускія мужчыны выпіваюць 18 л спірту ў год, жанчыны — 5,5 л. Між тым, згодна з СААЗ, максімальны ўзровень спажывання павінен складаць 8 літраў на чалавека. Калі ён ніжэйшы за восем літраў — умомант зніжаецца і траўматызм, і смяротнасць ад знешніх прычын, і смяротнасць ад вострых атручванняў алкаголем.

Акрамя агульнага ўзроўню спажывання алкаголю, ёсць яшчэ адзін важны паказчык — мадэль яго ўжывання. Калі паглядзець, што п'юць беларусы, то можна ўбачыць, што 49 % у нас займаюць моцныя спіртныя напоі, 26 % — мацаваныя віны.

Пры гэтым СААЗ не рэкамендуе ўжываць больш за дзве стандартныя адзінкі алкаголю ў дзень мужчынам і больш за адну стандартную адзінку — жанчынам. І не менш чым два дні на тыдзень трэба цалкам устрымлівацца ад алкаголю. Пад адной стандартнай адзінкай алкаголю маецца на ўвазе 10 грамаў чыстага спірту. Напрыклад, гэта 0,33 л піва, або адзін фужэр сухога віна, або адна чарка ў 35 мл моцных спіртных напояў. Усё, што вышэйшае за гэтыя дазіроўкі, адносіцца да рызыкоўнага ўжывання алкаголю, пры якім рэзка павялічваецца імавернасць наступстваў для здароўя.

**На дыспансерным уліку ў нашай краіне знаходзіцца прыблізна 158 тысяч чалавек з дыягназам «сіндром залежнасці ад алкаголю» і каля 95 тысяч чалавек пад прафілактычным наглядам.**

У каноэ на 1000 метраў Уладзіслаў Палешка і Мацвей Шалак фінішавалі першымі. У заключны дзень Аляксандра Калаур у каноэ выйграла на 200 метраў, у каноэ-двойцы з Лізаветай Прыходзькай яны перамаглі на 500 метраў. У байдарцы-адзіночцы на 500 метраў сярод юніёраў Веранiка Леанюк заваявала «золата», ёй таксама ўдалося стаць бронзавым прызёрам на 200 метраў. Акрамя залатых у актыве маладзёжнай і юніёрскай зборных Беларусі на чэмпіянатах Еўропы ў Рачыцы адзін сярэбраны і восем бронзавых медалёў. Усяго беларускія веслярры заваявалі пятнаццаць узнагарод.

***2. Беларускія спартсмены заваявалі пяць медалёў (адзін залаты, тры сярэбраныя і адзін бронзавы) на 30-й Сусветнай летняй Універсіядзе, якая прайшла ў Неапалі.*** Першую ўзнагароду зборнай Беларусі заваяваў плывец Рыгор Пякарскі на дыстанцыі 50 м батэрфляем, стаўшы трэцім. Таксама на рахунку зборнай «серабро» гімнаста Ягора Шарамкова ў апорным скачку. На верхнюю прыступку п'едэстала ўзнялася спартсменка ў бегу на 200 м Крысціна Ціманоўская. Узнагароды нашай зборнай прынесла і грацыя Юлія Еўчык, якая стала другой у практыкаваннях з мячом і з абручом.

Беларуская каманда ў агульным медальным заліку заняла 26-е месца. У лідарах знаходзіцца зборная Японіі — 82 узнагароды, на другой пазіцыі размясціліся атлеты з Расіі — 82 медалі.

***3. Максім Недасекаў заваяваў залаты медаль маладзёжнага чэмпіянату Еўропы (U-23) па лёгкай атлетыцы ў Еўле (Швецыя).*** У скачках у вышыню барацьба за першае месца разгарнулася паміж беларусам і брытанцам Томам Гейлам. Абодва атлеты паказалі вынік 2 м 27 см, суддзі прызначылі перасякочку, у якой лепш праявіў сябе Недасекаў, паўтарыўшы свой найлепшы вынік у сезоне (2 м 29 см). *«У пэўны момант здалося, што я сапраўды другі. Калі суддзі прызначылі перасякочку з брытанцам, вырашыў не ўпусціць апошні шанц і выдаў свой максімум»,* — адзначыў беларус. Нагадаем, у бягучым сезоне Максім перамог на II Еўрапейскіх гульнях у Мінску — 2 м 27 см. У 2017 годзе на юніёрскім кантынентальным форуме ў італьянскім Грасета ён таксама заняў першае месца з вынікам 2 м 33 см.




***4. Арына Сабаленка вярнулася ў першую дзясятку рэйтынгу Жаночай тэнісная асацыяцыі.*** Да старту Уімблдонскага турніру яна знаходзілася на 11-й пазіцыі. Вікторыя Азаранка займае цяпер 38-е месца, Аляксандра Сасновіч на 42-й пазіцыі, Вера Лапко на 120-м радку. Узначальвае рэйтынг Эшлі Барці (Аўстралія), другая — Наомі Осака, на трэцім радку Караліна Плішкава (Чэхія).

***5. Сталі вядомыя некаторыя вынікі матчаў 15-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Барысаўскі БАТЭ разграміў жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ» — 4:1. Брэсцкае «Дынама» на сваёй арэне саступіла мінскім дынамаўцам —1:2. Вынікі іншых гульняў: «Дняпро» (Магілёў) — «Энергетык-БДУ» (Мінск) — 3:4, «Мінск» — «Іслач» (Мінскі раён) — 3:3, «Тарпеда» (Мінск) — «Гомель» — 1:2, «Нёман» (Гродна) — «Слуцк» — 0:0. *Становішча ў групе лідараў:* БАТЭ — 37 ачкоў (15 матчаў), «Дынама» (Брэст) — 36 (14), «Шахцёр» — 31 (14), «Тарпеда-БелАЗ» — 27 (15), «Іслач» — 26 (15), «Дынама» (Мінск) — 25 (14).



**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ГІСТОРЫЯ ЗАХОЎВАЕЦЦА Ў ДРОБЯЗЯХ

## Як правільна рэстаўраваць могілкі?

**Прадстаўнік беларускага камітэта ICOMOS Цімафей АКУДОВІЧ адзначае, што ў іх арганізацыі ўсур'ёз занепакоены праблемай рэстаўрацыі могілак у нашай краіне. Пакуль што сітуацыя, якую давялося назіраць на Вайсковых могілках, не дадала аптымізму, а, наадварот, выклікала хутчэй сум і пярэчанні многіх спецыялістаў. Таму было вырашана выпрацаваць агульныя рэкамендацыі — як у будучым трэба падыходзіць да аднаўлення пахаванняў, якія ў той жа час з'яўляюцца аб'ектамі гісторыка-культурнай спадчыны.**

«Ёсць праблемы лакальныя, а ёсць глабальныя, — кажа Цімафей Акудовіч. — Глабальная праблема заключаецца ў тым, што ніхто сёння ў Беларусі не разумее, як рэстаўраваць гістарычна адметныя могілкі. Ёсць закон 2015 года, які абазначыў, што ўсе старыя надмагіллі мусяць быць добраўпарадкаваныя — так, каб выглядала прыгожа. Але як гэта рабіць — невядома. І вось ад такога неразумення пачалася разыходжанні...»

У камітэце ICOMOS паспрабавалі сабраць кансіліум найбольш дасведчаных, вопытных людзей у сферы аховы помнікаў, каб узгадніць супольны зварот. Ён будзе датычыцца найперш Вайсковых могілак, але таксама мець дачыненне да праблем рэканструкцыі могілак у Беларусі ўвогуле.

Відавочна, што работы на Вайсковых могілках — гэта першы прыклад рэканструкцыі могілак у Беларусі. І, хоча хтосьці гэтага ці не, яны будуць прыкладам для ўсёй Беларусі. Таму спецыялісты шчыра спадзяюцца, што гэты прыклад, які пачаўся па горшым сцэнарыі, прывядзе да выпрацоўкі новых падыходаў.

Важна таксама дадаць, што Вайсковыя могілкі — прыклад гістарычна адметнага ландшафту ў Беларусі. Яны ўваходзяць у топ-10 беларускіх гістарычных могілак. Менавіта таму да іх павінна быць асаблівае стаўленне. Такім чынам, спецыялісты распрацавалі наступныя прапановы, з якімі плануюць звяртацца ў Міністэрства культуры, да праекціроўшчыкаў і іншых адказных асоб.

### 1. Падгалоўнікам — не

«Мы катэгарычна супраць масавага выкарыстання ідэнтыфікацыйных знакаў у выглядзе падгалоўнікаў, — кажа Цімафей Акудовіч. — Бо яны кардынальна змяняюць знешні выгляд усіх могілак. Традыцыйныя гістарычныя беларускія пахаванні ў вялікай колькасці маюць вертыкальную накіраванасць: стэлы, каменныя крыжы, металічныя крыжы, драўляныя крыжы. З XII да XX стагоддзя нашы могілкі за рэдкім выключэннем мелі пазіцыю знізу ўверх. Гэта тое, што ствarae беларускія некропалі.



Зусім нядаўна на Вайсковых могілках знікла агароджа вакол пахавання першага прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі Усевалада Ігнатоўскага.

На Вайсковых могілках вайсковае пахаванне заўсёды аддзялялася ад цывільнага — таму паўсюднае выкарыстанне падгалоўнікаў змяняе аблічча гэтага ландшафту».



Месяц таму на гэтым месцы на могілках расло дрэва.

### 2. Агароджы — традыцыя, якую варта захаваць

«Значна больш складанае пытанне — агароджы, — працягвае спецыяліст. — Бо гэтая традыцыя пачала развівацца ў нас у XIX стагоддзі, яна працягвалася ў XX стагоддзі, а зараз знікае. Цяпер агароджы ў Беларусі не ставяцца, і больш за тое, на старых вясковых могілках, дзе ёсць актыўны святар, агароджы часта прыбіраюць. Логіка зразумелая — яны нязручныя, не вельмі проста прыбіраць магілу вакол. Таму прычыны сыходу гэтай традыцыі, такой вясковай моды зразумелыя.

Тым больш каштоўна для нас акцэнтаваць увагу на такіх агароджах на Вайсковых могілках. Бо калі мы адзначаем, што гэта традыцыя, якая знікае, мы мусім яе зафіксаваць у нейкім месцы — хоць бы адным, двух ці трох у Беларусі. І такім месцам, калі мы кажам менавіта пра традыцыю XX стагоддзя, мусяць быць менавіта Вайсковыя могілкі — наш галоўны трэнд міжваеннай Беларусі. Менавіта там агароджы павінны быць захаваныя. Можа, і не поўнасцю — пра гэта мусяць падумаць архітэктары. Але менавіта туды мы павінны прыйсці і ўбачыць гэтую моду, якая была ў першай палове XX стагоддзя».

### 3. Неад'емны элемент — дрэвы

«Звяртаем увагу, што традыцыйнай з'явай на беларускіх могілках з'яўляюцца дрэвы — яны заўсёды там былі. І дрэвы павінны застацца на Вайсковых могілках, — упэўнены ў ICOMOS. — У новай канцэпцыі аднаўлення Вайсковых могілак запланаваная пасадка туй — гэта нас моцна непакоіць. Бо важна захаваць на гістарычных помніках (мы не кажам пра ўсе могілкі) традыцыйныя дрэвы. Туі там будуць глядзецца нязвыкла.

Могілкавая мода змяняецца, гэта нармальна, калі сучасныя беларускія могілкі робяцца больш падобнымі на амерыканскія могілкі, на пэўны сусветны фармат — мінімум раслпіннасці, высаджаны толькі туі, — гэта прымальна, час дыктуе свае правілы. Аднак мы кажам пра помнік іншай катэгорыі, на ім ніякія іншаземныя расліны відавочна недапушчальныя.

### 4. Увага дробным формам

«Дарожкі не павінны змяняцца, — рэзюмуе Акудовіч. — У гэтым папросту няма сэнсу. Да такіх дробных формаў, як кветнікі, трэба ставіцца з нашмат большай увагай, бо ў падобных дробязях і захоўваецца гісторыя. Каштоўнасць могілак вызначаецца не толькі пэўнымі прыгожымі барэльефамі, але і дэталямі».

* * *

У беларускім камітэце ICOMOS прапановы па рэстаўрацыі гістарычна каштоўных могілак дапрацоўваюцца. Гатовы документ будзе накіраваны адказным асобам у ведамствы, якія кантралююць і ажыццяўляюць аднаўленне.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Паўла КАРАЛЁВА.**

Старонкі мінулага

# ШТО ТАКОЕ НАДЗЕЯ І ВЕРА

## У Навагрудку з'явілася Сцяна Памяці

**Тыдзень таму ў Навагрудку, каля Музея яўрэйскага супраціўлення, урачыста адкрылі Сцяну Памяці. Гэта помнік, прысвечаны ўцёку яўрэяў у верасні 1943 года з Навагрудскага гета. Таксама тут разгарнулася выстаўка пад адкрытым небам пад назвай «Гісторыя будаўніцтва тунэля і ўцёку ў сведчаннях яго ўдзельнікаў».**

Акрамя шматлікіх месцічаў на адкрыццё завіталі **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** з сынам Арцёмам, прадстаўнікі дыпламатычных корпусаў Вялікабрытаніі, ЗША, Ізраіля, кіраўніцтва Навагрудскага раёна на чале са **старшынёй райвыканкама Сяргеем ФЕДЧАНКАМ**. Пазней у Налібаках гасцей сустракаў **старшыня сельсавета Аляксандр ПІЛІНКЕВІЧ**.

Гэты дзень стаў таксама і днём сустрэчы шматлікіх нашчадкаў тых яўрэяў, якія здолелі выбрацца з навагрудскага гета. Яны з'ехаліся сюды, на беларускую зямлю, прывезлі з сабой дзяцей і ўнукаў, бо лічаць важным далучаць іх да агульнанацыянальнай памяці, вучыць стойкасці ў складаных жыццёвых сітуацыях.

Арганізатарам сустрэчы, як і аўтарам праекта па захаванні памяці пра трагедыю яўрэяў на Навагрудчыне, з'яўляецца **Тамара ВЯРШЫЦКАЯ**. Яна адзначала:

— У лёсе кожнага чалавека бываюць людзі, пасля сустрэчы з якімі цалкам змяняецца наша жыццё. Для мяне такім чалавекам стаў Джэк Каган. Ён адкрыў і мне, і ўсім нам гісторыю яўрэяў Навагрудка, гісторыю трагедыі і мужнасці. Яму было 13—14 гадоў, ён адзіны, хто застаўся ў жывых з сям'і. На маю думку, ён выжыў для таго, каб захаваць гісторыю для нас, таму што людзі, якія гэтую трагедыю перажылі, з'ехалі і многія гады маўчалі. Не казалі нават сваім родным, дзецям. Джэка Кагана больш няма з намі, але ёсць Музей яўрэйскага супраціўлення, які працягвае жыць і развівацца. Сёння на сустрэчу ў Навагрудак прыехала больш за 100 чалавек — нашчадкі партызанаў атрада Бельскага з ЗША, Канады, Аўстраліі, Германіі, Расіі, Украіны.

Замежныя госці зрабілі вялікі шлях, каб убачыць важныя, памятныя месцы, каб зразумець, адчуць штосьці важнае для сябе. Пра страшныя падзеі даўніх часоў яшчэ раз нагадаў старшыня Навагрудскага райвыканкама Сяргей Федчанка:

— Да вайны 63 % насельніцтва ў Навагрудку складалі яўрэі. Нароўні з беларусамі, палякамі і татарамі яўрэі будавалі і развівалі Навагрудак. Немцы захапілі горад ужо 4 ліпеня 1941 года. Праз тры тыдні на цэнтральнай плошчы наладзілі першы паказальны расстрэл яўрэяў. А ў снежні 1941 года стварылі гета. Расстрэлы сталі масавымі. Калі спачатку ў вязняў яшчэ і былі нейкія надзеі, то дзве масавыя кары 8 снежня 1941 года і 7 жніўня 1942 года, якія забралі жыцці тысяч бязвінных людзей, іх цалкам развеялі. Вязні зразумелі: адтуль ужо не выпусцяць. Адзіным спосабам выратавацца былі ўцёкі. 250-метровы падземны ход да свабоды капалі чатыры месяцы. Дажджлівай восеньскай ноччу 43-га праз тунэль бегла больш за дзвесце чалавек. Не ўсім удалося выбрацца, але тыя, хто паспеў, сышлі ў лес, дзе іх ужо чакаў партызанскі атрад братоў Бельскіх.

У Навагрудак завітаў і адзіны жывы з братоў Бельскіх Арон. Сёння яму 93 гады, і жыве ён у ЗША. Нашчадкі іншых братоў таксама прыехалі на Гродзеншчыну.



Фота Андрэя ДАРАФЕЕВА.

**Пасол Ізраіля ў Беларусі Алон ШОГАМ** падчас сваёй прамовы падзякаваў беларусам за памяць пра яўрэйскі партызанскі атрад насуперак савецкаму нарату, які замоўчваў ролю яўрэяў у часы вайны.

З дзвюма дочкамі з ЗША прыехала **Гэлен КУШНЕР-ЗЭЛІГ**, сваячка зяця і дарадцы амерыканскага прэзідэнта Дональда Трампа Джарэда Кушнера. Яе маці **Лея КУШНЕР** разам з іншымі яўрэямі падчас вайны ўцякла з Навагрудскага гета праз тунэль, які выкапалі вязні, і больш за год пражыла ў лагеры Бельскіх.

Такія сустрэчы сваякоў і вязняў гета стануць штогадовымі, упэўнена Тамара Вяршыцкая, якая запрашае ў наступным годзе далучацца ўсіх, хто не трапіў сёлета.

У свеце цяпер жыве 25 000 нашчадкаў тых 250 яўрэяў, якія выжылі ў Навагрудскім гета. Можна сказаць, што іх род ужо павялічыўся ў 100 разоў.

Нездарма рабін суполкі прагрэсіўнага іўдаізму «Бэйт-Сімха» Рыгор Абрамовіч з Мінску заўважыў: «Мы прыехалі сюды, каб вучыцца, што такое яўрэйская надзея і вера». Думаецца, гэта патрэбна і ўсім нам — нязломныя вера і надзея ў самых няпростых сітуацыях.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Пантэон Айчыны

# Павел Сапега

## *(1610—1665)*



Бываюць часы цяжкіх выпрабаванняў, калі патрэбны самаахвярныя і мужныя правадыр, які павёў бы за сабой іншых, усяліў у іх сэрцы веру ў перамогу. Роля асобы ў гісторыі часам бывае выключнай і нават вырашальнай. Такім чалавекам быў Павел Сапега, які ў гады «крывавага патопу» ўзначаліў абарону Рэчы Паспалітай ад заваёўнікаў. Як ён пісаў: «З удзячнасці мілай маёй Маці-Айчыне не шкадаваў для яе фартун, здароўя і крыві маёй».

Сын усвяцкага старосты Яна Пятра Сапегі і Софіі Вэйгар Павел вучыўся ў езуіцкім калегіуме ў Брунсбургу і ў 1631 годзе пасля заканчэння вучобы вярнуўся на радзіму. Пачалася яго палітычная і ваенная кар'ера. Ён удзельнічаў у 1632—1633 гадах у Смаленскай вайне і кіраваў коннай харугвай. І ледзь не загінуў пры штурме крэпасці Белай, калі побач з ім выбухнула міна. У часы вайны з украінскімі казакамі ён узначаліў полк і ўдзельнічаў у найбуйнейшых бітвах. Кароль Ян Казімір высока ацаніў заслугі і падараваў яму мястэчка Лёзны. А пасля смерці стрыечнага брата Казіміра Леона Сапегі, калі яму дасталіся Ружаны, Косава, Ляхавічы, Стары Быхаў, Бяроза, Чарэя і іншыя ўладанні, Павел Сапега стаў адным з найбагацейшых людзей у дзяржаве.

Так ужо здарылася, што ў першы перыяд вайны з Маскоўскай дзяржавай у 1654 годзе Павел Сапега знаходзіўся ў Бярэсці і збіраў войскі. Загадаў біць са свайго родавага срэбра грошы і плаціць жалаванне жаўнерам. У гэты час амаль усё Вялікае Княства Літоўскае разам са сталіцай была захоплена рускімі войскамі, а Жамойць акупавалі шведы. Частка беларускіх і літоўскіх магнатаў на чале з віленскім ваяводам і вялікім гетманам Янушам Радзівілам перайшла на бок Швецыі і заключыла з ёй Кейданаўскую унію. Войска Вялікага Княства пакінула свайго правадыра і падалося да Паўла Сапегі. Толькі ён у гэты цяжкі час мог абараніць Айчыну. Першае баявое хрышчэнне войска Сапегі адбылося 27 лістапада 1655 года каля вёскі Вярховічы, што за 25 вёрст ад Бярэсця. У Сапегі на той час было 6 тысяч жаўнераў супраць 28-тысячнага корпуса ваяводы Урусава, але ён прыняў бой і спыніў варожую раць. Гэта была першая перамога войска ВКЛ у вайне, якая ўзняла патрыятычныя памкненні ліцвінаў.

Неўзабаве войска Паўла Сапегі вырасла да 12 тысяч жаўнераў. Шведскі кароль і рускі цар прапаноўвалі Сапегу сваю пратэкцыю, але ён заставаўся верным каралю і вялікаму князю Яну Казіміру. І ўзнагародай яму сталі пасады віленскага ваяводы і вялікага гетмана літоўскага. Кароль прасіў Паўла Сапегу весці войска ў Польшчу ваяваць супраць шведаў, і ён у пачатку 1656 года выступіў у паход.

Прыход сапежынскага войска быў дарэчы. Каля Сандаміра польскае войска акружыла 10-тысячнае шведскае войска на чале з каралём Карлам Густавам. Сапега з 8 тысячамі жаўнераў спыніўся на правым беразе ракі Сана і закрыў шведам адзіны выхад з акружэння. Аднак 5 красавіка 1656 года шведы перапраівіліся цераз Сан, збілі перадавыя заставы сапежынцаў і вырваліся з вонкі. Сапега вызваліў ад шведаў Люблін, а пасля ўзяў у аблогу Варшаву. 1 ліпеня пасля штурму шведскі гарнізон капітуляваў. Утрымаць сталіцу ў сваіх руках Яну Казіміру не ўдалося. Шведы зноў захапілі Варшаву, але ўтрымаць яе не змаглі. 8 кастрычніка пад Пpосткамі ў Прусіі войска Сапегі разбіла шведска-брандэбургскі корпус. Пералом у вайне са Швецыяй надышоў. Павел Сапега вярнуў веру ў перамогу, паказаў прыклад самаахвярнасці. Ён не шкадаваў сябе: «... усё ў сябе страціў, са скрухі знясілеў, не чую сваёй галавы, сэрца ўсё ссохла».

Новы вораг рушыў у 1657 годзе на Рэч Паспалітую — семіградскі князь Юрый Ракашы. У Вялікае Княства Літоўскае Ракашы паслаў універсалы, у якіх заклікаў выбраць яго вялікім князем. Ліцвінская шляхта і шляхта Люблінскага ваяводства пастанавілі на з'ездзе ў Бельску: «З кім будзе гетман Павел Сапега, з тым будзем і мы». А Сапега быў верны законнаму ўладару каралю Яну Казіміру.

Ракашы і яго саюзнік шведскі кароль Карл Густаў захапілі Бярэсце. Аднак Сапега вызваліў горад і пайшоў у пагоню за Ракашы. Пад Меджыбогам на Валыні польскае войка і войска Сапегі акружылі Ракашы, і той вымушаны быў капітуляваць.

У 1658—1659 гады Сапегу давялося змагацца на два франты — супраць шведаў і маскавітаў. Сіл не ставала. Сапежынскае войска (якое называлі Сапежынскай дывізіяй) ваявала ў Курляндыі са шведамі і вызваліла там шэраг гарадоў. І толькі калі ў 1660 годзе быў заключаны мір з Швецыяй, стала магчыма кінуць усе сілы супраць царскіх ратей. «Я увесь знясілены на здароўе, але не стамлюся зычліва старацца, каб айчыну ў такім цяжкім становішчы выратаваць», — заявіў Сапега.

28 чэрвеня 1660 года каля вёскі Палонка непадалёк ад Ляхавіч адбылася найбуйнейшая ў гэтай вайне бітва. Супраць 24-тысячнага войска ваяводы Івана Хаванскага выступіла дывізія Сапегі ў 8 тысяч жаўнераў і дывізія Стэфана Чарнецкага ў 6 тысяч жаўнераў. Хаванскі быў разбіты і ганебна ўцёк з поля сечы. Павел Сапега сціпла прамаўчаў пра сябе, але адзначыў гераізм жаўнераў. «Ахвоту, працу і непараўнальную дзейнасць войска цяжка выказаць. Сэрца радуецца, гледзячы, як іх Бог падбадзёрваў, і ўсе спадзяюцца і надзею нашу праз іх справавуюць». Затое Стэфан Чарнецкі адзначыў чынны ўнёсак у перамогу Паўла Сапегі: «Гетман мужна здароўя свайго не шкадаваў і супраць непрыяцеля працавіта стаяў».

Гэтая перамога была пачаткам пералому ў вайне з Маскоўскім царствам. Войска ВКЛ перайшло ў наступ і 3 ліпеня вызваліла Менск. Цар Аляксей Міхайлавіч паслаў на Беларусь 45-тысячную раць пад камандай князя Юрыя Даўгарукага. Бітва з ёй адбылася 8 кастрычніка 1660 года за дзве мілі ад Магілёва на рацэ Бася. У Сапегі і Чарнецкага было разам 12 тысяч жаўнераў. Хаванскі пахваляўся, што разаб'е іх за гадзіну. Але польскія і ліцвінскія воіны змагаліся як героі. Галоўны ўдар прыняла дывізія Паўла Сапегі, якая трымала цэнтр. Сам гетман знаходзіўся ў гушчы бітвы. Пад ім забілі каня, і Сапега цудам выратаваўся ад смерці. Гераізм сапежнікаў даў магчымасць флангам перайсці ў наступ і адкінуць непрыяцеля. Нягледзячы на колькасную перавагу, Даўгарукі схаваўся ў лагеры і стаў чакаць падыходу з Полацка войска Івана Хаванскага. Насустрач яму выступіў са сваёй дывізіяй Павел Сапега. І на гэты раз Хаванскі быў разбіты. З рэшткамі свайго войска ён уцёк у Полацк. Маральны дух рускіх воінаў быў падарваны.

Ян Казімір адзначыў, што Сапега, «не шкадуючы фартуны, дастатку свайго, без ніякага для сябе прыбытку не толькі ўласнасць сваю аддаваў, але і ў розных крэдытораў вялікія сумы на тыя высокія патрэбы браў і ахвотна даваў». Так была адзначана арганізацыйная роля Сапегі ў перамозе.

Пасля выступу жаўнераў (канфедэрацыі) Павел Сапега доўгі час не мог узначальваць войска — вельмі перажываў з гэтага. «Сіроцтва краёў беларускіх... і маё сціскае сэрца. Але што рабіць, калі Айчына прыходзіць на такую нешчаслівасць?» Састарэлы гетман гатовы быў служыць «асірацелай Айчыне». І ў 1663 годзе Сапега зноў узначаліў войска і падрыхтаваў яго для паходаў на Украіну, але ад хваробы вымушаны застацца дома.

Апошнія падзеі вайны адбываліся без удзелу Паўла Сапегі. Хвароба адняла сілы. 30 снежня 1665 года гетман памёр у Ружанскім палацы і быў пахаваны ў Бярозаўскім кляштары картэзіянцаў. Сучаснікі назвалі яго Liberator Litvaniae — вызваліцелем Літвы. А гісторыкі адзначылі яго асаблівыя заслугі. «Калі Вялікае Княства Літоўскае захавалася ў цэласці і адабрана з непрыяцельскіх рук, то гэта ўсё Паўла Сапегі дзейнасць».

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Сваімі словамі

# ДЫМ НАД ВАДОЙ. А ДОМ — ЛЯ ВОЗЕРА,

## або Дзе гняздзяцца паэты?



Лета — тая пара, калі самае цікавае адбываецца дзесьці ў раёнах. Таму варта выбраць для сябе які-небудзь мясцовы фестываль, што ладзіцца тамтэйшымі энтузіястамі, каб адпачыць ад сталіцы, ад буйных гарадоў, ад вялікіх натоўпаў. Каб быць бліжэй да прыроды. Бліжэй да невялікіх, але важных спраў.

Куды ж можна выбрацца ў найбліжэйшыя два месяцы з карысцю для сябе і з прыемнасцю для наваколля? Колькі часу таму «Звязда» пісала пра культурны цэнтр, які ўтварыўся на ўскрайку Беларусі, — «Культыватар» у Лынтупах. Адна добрая ініцыятыва звычайна натхняе кагосьці і спараджае іншую ініцыятыву. Гэтым летам у Лынтупах пройдзе зусім новае свята — пленэр і фестываль эксперыментальнай керамікі «Дым» — ён будзе ладзіцца з 12 па 24 жніўня.

Арганізатар фестывалю керамiст Дар'я Мандзік адзначае, што летась яна была ў вялікім керамічным падарожжы па Партугаліі і Украіне і заўважыла, якія цуды здараюцца, калі разам збіраюцца розныя творчыя людзі. Таму разам з Настассяй Мілаванавай (другім арганізатарам) яны вырашылі зладзіць такі керамічны «эксперымент», які зусім нечакана для іх саміх стаў міжнародным (удзел у ім возьмуць не толькі керамісты з Беларусі, але і майстры з Расіі і Балгарыі).


На тэрасе «Дома ля возера».

Арганізатары фестывалю на краўдфандынгавай пляцоўцы ulej.by распачалі збор сродкаў, каб падтрымаць будучае керамічнае дзейства. Знайшоўшы на сайце праект з назвай «Дым», можна ўбачыць цікавыя лоты — напрыклад, вырабы майстроў-керамістаў, што зробяць у Лынтупах, ці (прапанова цікавая для майстроў) магчымасць абпаліць свае вырабы на фестывалі ў печы... Сярод іншага — магчымасць паўдзельнічаць у двухдзённым керамічным інтэнсіве 17 і 18 жніўня (кошт 120 рублёў).

24 жніўня адбудзецца ўласна фестываль «Дым», куды запрашаюцца ўсе ахвотныя. Яго разынкай стане вечаровае вогненнае шоу — полымя будзе гарэць у вялікіх гліняных статуях, якія зляпяць удзельнікі пленэру.

Калі ж даехаць у Лынтупы, на край Беларусі, не атрымаецца, можна спыніцца бліжэй да яе сэрца — на Вілейшчыне. З 9 да 11 жніўня тут, у вёсцы Навасады Нарачанскага сельскага савета, пройдзе фэст з рамантычнай назвай «Дом ля возера». І гэта свята для адпачынку на любы густ. Бо арганізатары абяцаюць «карысныя лекцыі, аўтарскую музыку, паэзію, кіно, рыбалку, жывую бібліятэку, эксклюзіўную кухню, пленэр, танцы і выставы». Пагадзіцеся, выбраць ёсць з чаго!

Варта адзначыць, што гаспадар «Дома ля возера» Алег Куралесаў перасяліўся сюды некалькі гадоў таму. З таго часу ён паступова перабудоўвае сваё жытло, а таксама ладзіць розныя «варушнякі». Акрамя летняга фестывалю (сёлетні будзе ўжо другім па ліку) тут ладзіліся кінапаказы, літаратурныя вечарыны, некалькі зімовых свят і хакей. Адна з мэт — далучэнне да адукацыйнага працэсу і забаў мясцовых жыхароў, бо разам, згадзіцеся, сапраўды весялей.

Асаблівую цікавасць уяўляе і сам дом, яго аздоба — ліхтарыкі розных выглядаў, сцяна, зробленая з... кніг, крэслы-мяшкі, магчымасць заначаваць на паддашку... Такія месцы, зробленыя з душой, хочацца не проста ўбачыць — яны натхняюць на тое, каб і мы самі ўпрыгожвалі неяк гэты свет.

Напрыканцы, каб вы зусім дакладна ўпэўніліся, што Беларусь — краіна крэатыўных людзей, якія не шкадуюць вольнага часу дзеля сваіх ідэй, варта згадаць, што з 2 да 4 жніўня ў вёсцы Белая Царква, каля Чарэі, дзе знаходзіцца родавая сядзіба Мілашаў, адбудзецца фестываль SPRAVA. Трэба дадаць, што ў Белай Царкве сапраўды ёсць мураваная царква (гэта не толькі прыгожая назва), а само паселішча знаходзіцца на паўвостраве ў возеры — таму выглядае вельмі маляўніча, месца для фэсту выбрана вельмі ўдалае.

Падчас «Справы» (уваход на фестываль платны) можна будзе пачуць шмат розных гуртоў — пералічваць іх не мае сэнсу, бо ўжо запланавана больш за 20 (!) канцэртаў. У гэты ж час на ўскрайку паўвострава будзе будавацца вышка для назірання за птушкамі — ахвотныя могуць узяць удзел у гэтых работах.

Напярэдадні, у другой палове ліпеня, у Белай Царкве адбудзецца летнік Беларускай асацыяцыі студэнтаў-архітэктараў. За час летніка студэнты і валанцёры збудуюць так званае «Гняздоўе паэтаў». Маладыя архітэктары будуць майстраваць домікі над, каля і пад дрэвамі (хатку, гняздо, кокан, ляжак). Збудаванні павінны атрымацца экалагічныя, бяспечныя, зручныя (каб пры жаданні імі маглі скарыстацца і дзеці). Але і гэта яшчэ не ўсё. З 2 да 4 жніўня тут адбудзецца яшчэ адно «Гняздоўе паэтаў» — паэтычная частка фестывалю, якую курыруе вядомы сучасны творца Дзмітрый Строцаў. Проста цяпер ён працуе над стварэннем небанальнай, яркай праграмы. І не кажыце, калі ласка, пасля ўсяго гэтага, што ў Беларусі сумна жыць!

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении**
**31 июля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 25 %**
**по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Условие продажи:** 1) Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2) Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 3) В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | |
| | **Местонахождение лотов № 1–8, 11–17, 19–24, 26–32, 37, 38, 40, 41, 42, 44–59, 61:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8. **Информация о земельном участке:** лоты № 1, 3, 4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000006001208 общей площадью 1,6216 га (право аренды, доля в праве 631/1000). **Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации и обслуживания здания контрольно-пропускного пункта и складского помещения. **Информация о земельном участке:** лот № 2 расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006003031 общей площадью 0,7603 га (право постоянного пользования, доля в праве 69/100). **Целевое назначение земельного участка:** для эксплуатации и обслуживания производственной базы | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. №350/С-166469** общей площадью 953,9 кв. м, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание специализированное автомобильного транспорта. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8/2. **В состав лота №1 входит:** Недвижимые улучшения – Ограждение территории ПМК-94 (забор бетонный h-2м, L-3м, протяженность 231м), (инв. № 1004). Инженерные сети – Сети ливневой канализации (асбестоцементные трубы d-300 мм, L- 104 м, d-150 мм, L-7 м, глубина заложения 2 м) (инв. № 681). Инженерные сети – Сети электроснабжения (АВВГ 4х16, L- 285 м по стене здания; АВВГ 4х10, L- 85 м, воздушная, по 3 ж. б. опорам; АВВГ 4х35, L- 73 м; АВВГ 4х25, L- 32 м, по стене зданий) (инв. № 1694). Асфальтобетонное покрытие, площадь 8392 м² (инв. № 16). Биотуалет (инв. № 987). Нагреватель дизельный не прямого нагрева Kroil MA-55 (инв. № 5491/1207130212). Тепловая дизельная пушка напр. 26 квт 400 м МОН 26М (инв. № 699). Трансформатор сварочный ТДМ (инв. № 5052). Трансформатор сварочный ТДМ (инв. № 5504). Сварочный выпрямитель ВД 301У3 (инв. № 517) | **244 710,00** | 12 235,50 | 24 471,00 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 350/D-176613** общей площадью 684,4 кв. м, назначение – помещение многофункциональное, наименование – помещение многофункциональное. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8. Подробный и полный перечень имущества по лоту № 2 опубликован в газете «Звязда» от 30.03.2019 г. № 60 (28927) | **265 114,50** | 13 255,73 | 26 511,45 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 350/D-253538,** общей площадью 318,6 кв. м, назначение – складское помещение, наименование – складское помещение. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8/1-1. Биотуалет инв. № 988с | **50 662,50** | 2 533,13 | 5 066,25 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. №350/С-77704** общей площадью 350,3 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – столярный цех, мастерские ОГМ. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Борисенко, 8 | **58 650,00** | 2 932,50 | 5 865,00 |
| 5 | Блок-контейнер с электрикой 6,0 м х 2,45 м (на шасси), инв. № 5479 | **2 025,00** | 101,25 | 202,50 |
| 6 | Блок-контейнер 6,0х2,45 м (на шасси) инв. № 687 | **2 025,00** | 101,25 | 202,50 |
| 7 | Блок-контейнер 6,0х2,45 м (на шасси), инв. № 686 | **2 025,00** | 101,25 | 202,50 |
| 8 | Блок-контейнер 6,0х2,45 м (на шасси), инв. № 1479 | **2 025,00** | 101,25 | 202,50 |
| 11 | Вагон-бытовка 9,0 м х3,0 м, инв. № 5038 | **1 950,00** | 97,50 | 195,00 |
| 12 | Вагон-бытовка 9,0 м х3,0 м инв. № 983 | **1 950,00** | 97,50 | 195,00 |
| 13 | Вагон-дом 7,9м х 2,7м х2,5м(на шасси), инв. № 181 | **2 175,00** | 108,75 | 217,50 |
| 14 | Вагон-бытовка 6,9х 2,5х3,04 м (на шасси) инв. № 20029 | **2 325,00** | 116,25 | 232,50 |
| 15 | Вагон-дом 6,9х 2,5х3,04 м (на шасси), инв. № 2026 | **2 325,00** | 116,25 | 232,50 |
| 16 | Эстакада автомобильная 10,0 х 2 колеи: 0,8 м и 0,85 м. инв. № 1166 | **2 700,00** | 135,00 | 270,00 |
| 17 | Легковой автомобиль VOLKSWAGEN PASSAT, 2006 г. выпуска, регистрационный номер 1069 ВК-3, идентификационный номер (помер кузова) WVWZZZ3CZ7P025258 | **9 150,00** | 457,50 | 915,00 |
| 19 | Станция насосная мод.834/24В, инв. № 6911/6000000324PR. Станция штукатурная ШС-4/6 (СО-50-АМ), инв. № 5466 | **2 775,00** | 138,75 | 277,50 |
| 20 | Установка для выдачи и перемешивания раствора У 342М, инв. № 698 | **1 800,00** | 90,00 | 180,00 |
| 21 | Штукатурная станция СШ-6 СО 50АМ, инв. № 5460/993 | **2 250,00** | 112,50 | 225,00 |
| 22 | Штукатурная станция СШ-6 СО 50АМ, инв. № 665/119 | **2 250,00** | 112,50 | 225,00 |
| 23 | Штукатурный агрегат BNS Master-Plaster, инв. № 697 | **2 250,00** | 112,50 | 225,00 |
| 24 | Установка для приема товарного бетона УВР-4, инв. № 6922 | **2 475,00** | 123,75 | 247,50 |
| 26 | Грузовой специальный автобетоносмеситель КАМАЗ 65115, кузов (рама) № X6S58147D80004993, XTC65115381158996, 2008 года выпуска, рег. знак АЕ 1627-3 | **17 400,00** | 870,00 | 1 740,00 |
| 27 | Грузовой специальный автобетоносмеситель КАМАЗ 65115 Д3, кузов (рама) № X6S58147Z80004894, XTC65115382337529, 2008 года выпуска, рег. знак АЕ 0630-3 | **17 400,00** | 870,00 | 1 740,00 |
| 28 | **Бульдозер Б10М,** заводской (серийный, идентификационный) № 42411, шасси № 162732, 2008 года выпуска, рег. знак ЕВ-3 1513 | **33 525,00** | 1 676,25 | 3 352,50 |
| 29 | Каток вибрационный «АМКОДОР» 6622А, заводской (серийный, идентификационный) № 0409031, 2009 года выпуска, рег. знак ЕВ-3 2671 | **27 300,00** | 1 365,00 | 2 730,00 |
| 30 | Каток самоходный вибрационный «АМКОДОР» 6712 В, заводской (серийный, идентификационный) № 04100041, 2010 года выпуска, рег. знак ЕК-3 2024 | **32 175,00** | 1 608,75 | 3 217,50 |
| 31 | **Грузовой прицеп 2ПТС-4,** идентификационный номер – н/у, 1989 года выпуска, рег. знак ГЮ 8841 | **600,00** | 30,00 | 60,00 |
| 32 | Полуприцеп специальный платформа МАЗ 93384 А, кузов (рама) № X4493384A60000012, 2006 года выпуска, рег. знак А 0497 А-3 | **10 575,00** | 528,75 | 1 057,50 |
| 37 | **Экскаватор ЕВ-К-14,** заводской (серийный, идентификационный) № Y39EBK14090006012, 2008 года выпуска, рег. знак ЕВ-3 2691 | **11 550,00** | 577,50 | 1 155,00 |
| 38 | Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 6303 А5 СМБ-372, кузов (рама) № Y3M6303A590001164, Y3BCMБ37290000123, 2009 года выпуска, рег. знак АЕ 0290-3 | **14 025,00** | 701,25 | 1 402,50 |
| 40 | **Автомобиль ГАЗ 27057,** кузов (рама) № 27050080400053, X9627057080624555, 2008 года выпуска, рег. знак АВ 8108-3 | **3 150,00** | 157,50 | 315,00 |
| 41 | **Автомобиль ГАЗ 32213,** кузов (рама) № 32210080405730, X9632213080629823, 2008 года выпуска, рег. знак АВ 8107-3 | **3 300,00** | 165,00 | 330,00 |
| 42 | **Автомобиль ГАЗ 32213,** кузов (рама) № 32210070332363, X9632213070556845, 2007 года выпуска, рег. знак АВ 1164-3 | **2 625,00** | 131,25 | 262,50 |
| 44 | **Автомобиль ГАЗ 330232,** кузов (рама) № 33023070077808, X9633023272235452, 2007 года выпуска, рег. знак АК 1845-3 | **2 550,00** | 127,50 | 255,00 |
| 45 | Грузовой самосвал МАЗ 5551А2 325, кузов (рама) № Y3M5551A290001554, 2008 года выпуска, рег. знак АВ 8972-3 | **13 950,00** | 697,50 | 1 395,00 |
| 46 | Грузовой самосвал МАЗ 555102 223, кузов (рама) № Y3M55510290013261, 2009 года выпуска, рег. знак АЕ 1927-3 | **10 275,00** | 513,75 | 1 027,50 |
| 47 | Грузовой самосвал МАЗ 5551А2 323, кузов (рама) № Y3M5551A290001858, 2009 года выпуска, рег. знак АЕ 2412-3 | **13 725,00** | 686,25 | 1 372,50 |
| 48 | **Седельный тягач МАЗ 6422А8 330,** кузов (рама) № Y3M6422A890001369, 2009 года выпуска, рег. знак АЕ 2413-3 | **22 650,00** | 1 132,50 | 2 265,00 |
| 49 | **Полуприцеп бортовой МАЗ 975800 2012,** кузов (рама) № Y3M97580090011654, 2009 года выпуска, рег. знак А 3917 А-3. Кассета для перевозки камня силикатного (металлические поддоны с резиновыми ремнями) инв. №24700667. Седельный тягач МАЗ 6422А8 330, кузов (рама) № Y3M6422A890001184, 2008 года выпуска, рег. знак AI 3268-3 | **29 962,50** | 1 498,13 | 2 996,25 |
| 50 | Автомобиль ГАЗ 2705, кузов (рама) № 27050080403768, X9627050080627713, 2008 года выпуска, рег. знак АЕ 0554-3 | **3 000,00** | 150,00 | 300,00 |
| 51 | Автомобиль ГАЗ 32213, кузов (рама) № 32210070294545, X9632213070519523, 2006 года выпуска, рег. знак АА 9356-3 | **2 700,00** | 135,00 | 270,00 |
| 52 | Автомобиль ГАЗ 32213, кузов (рама) № 32210070297691, X9632213070522452, 2007 года выпуска, рег. знак АА 9355-3 | **3 225,00** | 161,25 | 322,50 |
| 53 | Грузовой самосвал МАЗ 555102 220, кузов (рама) № Y3M55510260009651, 2006 года выпуска, рег. знак АА 6165-3 | **7 875,00** | 393,75 | 787,50 |
| 54 | Грузовой самосвал МАЗ 555102 220, кузов (рама) № Y3M55510260009644, 2006 года выпуска, рег. знак АА 6166-3 | **7 875,00** | 393,75 | 787,50 |
| 55 | Грузовой самосвал МАЗ 555102 220, кузов (рама) № Y3M55510260009602, 2006 года выпуска, рег. знак АА 6139-3 | **7 875,00** | 393,75 | 787,50 |
| 56 | Грузовой самосвал МАЗ 5551А2 325, кузов (рама) № Y3M5551A290001569, 2008 года выпуска, рег. знак AI 1945-3 | **13 950,00** | 697,50 | 1 395,00 |
| 57 | Грузовой самосвал МАЗ 5551А2 325, кузов (рама) № Y3M5551A290001573, 2008 года выпуска, рег. знак AI 1201-3 | **13 950,00** | 697,50 | 1 395,00 |
| 58 | Седельный тягач МАЗ 6422А8 332, кузов (рама) № Y3M6422A890001381, 2009 года выпуска, рег. знак АЕ 2430-3. Полуприцеп бортовой МАЗ 938660 044, кузов (рама) № Y3M93866080009760, 2008 года выпуска, рег. знак А 3204 А-3. Кассета для перевозки камня силикатного (металлические поддоны резиновыми ремнями), инв. № 27400668. | **30 480,00** | 1 524,00 | 3 048,00 |
| 59 | Автомобиль ГАЗ 32213, кузов (рама) № 32210090408797, X9632213090632814, 2008 года выпуска, рег. знак АЕ 0552-3 | **3 075,00** | 153,75 | 307,50 |
| 61 | Полуприцеп специальный платформа МАЗ 937900 010, кузов (рама) № Y3M93790090000381, 2009 года выпуска, рег. знак А 3506 А-3 | **10 725,00** | 536,25 | 1 072,50 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»): Р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2). Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 16 июля 2019 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и 14-00 до 16-00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 29 июля 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.03.2019 г. № 60 (28927). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:**

В извещение о проведении электронных торгов по продаже имущества ООО «Белхартэх», опубликованном в газете «Звязда» от 12.07.2019 г., вносится изменение: «**Начальная цена лота № 1** (установка плазменной резки с БМТ 1560ПР + источник Powermax 105A) без НДС составляет 27 963,00 бел. руб., шаг аукциона – 1 398,15 бел. руб.»

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

**УНП 190496731**

**ОАО «Лидапищеконцентраты»**
**сообщает, что 25 июля 2019 года в 11.00**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров**

Место нахождения общества: г. Лида, ул. Тавлая, 11.

Место проведения собрания: помещение актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. «О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Лидапищеконцентраты».
2. «О внесении изменений и дополнений в Положение «О наблюдательном совете ОАО «Лидапищеконцентраты».

Акционеры (их представители) имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания в рабочие дни с 12 июля 2019 года с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11 (приемная секретаря руководителя), а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.

Регистрация участников собрания – с 10.00 до 10.50 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 500021268 **Наблюдательный совет.**

**ОБЪЯВЛЕНИЕ**
**Открытое акционерное общество «Мехколонна № 93»**
(далее – ОАО «Мехколонна № 93»),

расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 13, сообщает о том, что наблюдательным советом ОАО «Мехколонна № 93» принято решение о проведении **29 июля 2019 года в 11.00** внеочередного общего собрания акционеров (протокол № 5 от 11.07.2019 года), согласно п. 30 Устава ОАО «Мехколонна № 93».

Место проведения собрания: 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 13, кабинет 303.

Форма проведения – очная.

**Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Мехколонна № 93»:**

1. Об утверждении разделительного баланса.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13 (каб. 214), в период с 16 июля 2019 г. по 26 июля 2019 г. по рабочим дням, с 10.00 до 16.00 либо 29 июля 2019 года по месту проведения собрания.

**Регистрация акционеров внеочередного общего собрания будет проводиться 29 июля 2019 г. с 10.00 до 10.50 по месту проведения общего собрания.**

**Начало работы собрания – 29 июля 2019 года в 11.00.**

**Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 24 июля 2019 года.**

Для регистрации при себе необходимо иметь следующие документы: акционеру ОАО «Мехколонна № 93» (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение, и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100003019 **Наблюдательный совет.**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о повторном аукционе**

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 412/С-26429 (назначение – здание специализированное культурно-просветительского и зрелищного назначения, наименование – здание клуба), обшей площадью 188,8 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Лунненский с/с, д. Мешетники, 60Б

